Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

6 ВЕРАСНЯ 2014 г. СУБОТА № 169 (27779) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Удзельнікам і гасцям урачыстасцяў Дня беларускага пісьменства

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую вас з Днём беларускага пісьменства, які сёлета праводзіцца ў старажытным горадзе Заслаўе.

За гады свайго існавання свята заняло пачэснае месца ў шэрагу найважнейшых падзей культурнага жыцця нашай краіны і яскрава нагадвае пра неабходнасць беражлівага захавання духоўнай спадчыны Беларусі.

Ад часоў Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага кніга заўсёды была для беларусаў жыватворнай крыніцай, надзейным падмуркам нацыянальнага развіцця. Літаратура выхоўвала ў людзях лепшыя якасці, аказвала вялікі, а часам і вызначальны ўплыў на фарміраванне іх светапогляду.

Сёння беларуская дзяржава актыўна падтрымлівае нацыянальную інфармацыйную прастору, айчыннае кнігавыданне ў мэтах кансалідацыі грамадства, сцвярджэння высокіх маральных каштоўнасцяў і ідэалаў.

Шчыра жадаю ўсім удзельнікам і гасцям свята моцнага здароўя, дабрабыту, новых творчых і працоўных дасягненняў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Далягляды Асветы і Духоўнасці

Сёння і заўтра ў Заслаўі святкуюць Дзень беларускага пісьменства

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



■ З нагоды

ЗНАЙСЦІ ШЛЯХ ДА ЧЫТАЧА

Свята беларускага пісьменства, якое штогод праходзіць у нашай краіне ўжо на працягу больш як дваццаці гадоў, не страчвае сваёй актуальнасці, па-ранейшаму застаецца выдатнай магчымасцю для тых, хто мае дачыненне да друкаванага слова, і для чытачоў пазнаёміцца, падзяліцца ўражаннямі і натхненнем. Штогод з'яўляюцца новыя імёны, перыядычныя выданні і кнігі, дый чытачоў у іх не меншае. Дзень беларускага пісьменства — таму яскравае сведчанне. Аб тым, што дапамагае захоўваць беларусам традыцыі чытання, як друкаваным выданням выжыць у стагоддзе найноўшых тэхналогій і канкурэнцыі, — наша перадсвяточная гутарка з Міністрам інфармацыі Беларусі Ліліяй АНАНІЧ.

ISSN 1990 - 763X

— Лілія Станіславаўна, дзяржаўны статус свята пісьменства сведчыць аб тым, што пісьменнікам, журналістам, выдаўцам — усім, хто мае дачыненне да друкаванага слова, надаецца належная ўвага і падтрымка менавіта на дзяржаўным узроўні. Але не менш важная падтрымка для тых, хто піша і выдае, — запатрабаванасць у чытачоў.

На думку Міністра інфармацыі, мы па-ранейшаму застаёмся нацыяй, якая чытае?

— Несумненна. Вы звярнулі ўвагу, што ў большасці сваёй робяць людзі — і маладыя, і больш сталага ўзросту — у грамадскім транспарце? Яны чытаюць! Кнігі, часопісы, газеты, электронныя кнігі, тэксты на экранах планшэтаў і смартфонаў… Кніга, перыёдыка для нас па-ранейшаму застаецца крыніцай ведаў, натхнення, добрага адпачынку. Як сведчанне запатрабаванасці напісанага, надрукаванага слова — і мастацкага, і навуковага, і публіцыстычнага, — лічбы, якія можна прыводзіць сёння з гонарам. У нашай краіне дзейнічае каля 400 выдавецтваў, выходзіць у свет 1570 перыядычных выданняў (711 газет, 859 часопісаў, бюлетэняў, каталогаў і альманахаў). Толькі за мінулы год у выдавецтвах розных формаў уласнасці выйшла звыш 11 тысяч найменняў кніжнай прадукцыі агульным тыражом 31,5 мільёна экзэмпляраў… І тое, што ў Беларусі адбудзецца XXI Дзень беларускага пісьменства сапраўды сведчыць пра вялікі клопат дзяржавы, пра духоўна-маральнае развіццё грамадства.

СТАР. 3

СПЫНІЦЬ АГОНЬ!

Удзельнікі мінскай сустрэчы падпісалі дакумент аб спыненні агню на паўднёвым усходзе Украіны ўчора ў 18.00. Аб гэтым паведаміла журналістам у Мінску афіцыйны прадстаўнік дзейнага старшыні АБСЕ па пытаннях урэгулявання сітуацыі ва Украіне Адэльхейд Тальявіні, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Прадстаўнікі бакоў, што вядуць перагаворы, удакладнілі, што ўчора падпісаны пратакол з некалькіх пунктаў, адным з якіх з'яўляецца ўмова аб неадкладным спыненні агню з 18.00.

Кіраўнік самаабвешчанай Луганскай народнай рэспублікі Ігар Плотніцкі ўдакладніў, што агонь павінен быць спынены ў 18.00 менавіта па мінскім часе.

У сваю чаргу прэм'ер-міністр самаабвешчанай Данецкай народнай рэспублікі Аляксандр Захарчанка сказаў: «Спыненне агню дасць магчымасць захаваць жыцці людзей: не толькі мірных грамадзян, але і тых, хто змагаецца са зброяй у руках, змагаецца за свае ідэалы».

Па выніках работы кантактнай групы адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з экс-прэзідэнтам Украіны Леанідам Кучмам. Леанід Кучма падрабязна праінфармаваў Аляксандра Лукашэнку аб выніках працы кантактнай групы Расія-Украіна-АБСЕ па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне і падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за магчымасць так канструктыўна і вынікова працаваць у Мінску. Як адзначыў Леанід Кучма, сама абстаноўка ў Мінску спрыяла таму, каб перамоўны працэс, якім бы цяжкім ён ні быў, аказаўся паспяховым. Паводле яго слоў, немагчыма было не дамовіцца, паколькі сама беларуская зямля спрыяе міру і згодзе.

ПРЫГРАНІЧНАЯ ТЭРЫТОРЫЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 верасня падпісаў указ № 433 «Аб унясенні змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 сакавіка 2009 г. № 125», якім устанаўліваецца прыгранічная тэрыторыя ў межах адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, што прымыкаюць да дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй.

Гэта дасць магчымасць стварыць умовы для рэалізацыі ўскладзеных на органы пагранічнай службы задач і функцый у межах гэтай мясцовасці, а таксама арганізаваць належнае ўзаемадзеянне з пагранічнымі органамі Расійскай Федэрацыі, накіраванае на вырашэнне задач па выяўленні і спыненні транзітнай незаконнай міграцыі, наркатрафіку і незаконнага перамяшчэння праз мяжу таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў.

■ Ёсць рэзерв

ДАРОГУ МАЛАДЫМ

БЕЛАРУСКАМУ РЭСПУБЛІКАНСКАМУ САЮЗУ МОЛАДЗІ — 12 ГАДОЎ

Сёння самая масавая маладзёжная арганізацыя краіны адзначае дзень нараджэння. Гэта добрая нагода, каб падвесці вынікі працы і вырашыць, у якім кірунку развівацца.

Як адзначыў **Першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Ігар БУЗОЎСКІ,** сёння асаблівая ўвага надаецца студатрадам, якія працуюць ужо не толькі летам, а на працягу ўсяго года: так мяркуецца забяспечыць працай кожнага, хто мае ў ёй патрэбу. Актыўна вядзецца пошук парытэту паміж годным заробкам і добрымі ўмовамі працы, але ўжо ёсць добрыя прыклады, калі «байцы» атрымалі ў сярэднім па 9 мільёнаў рублёў за месяц працы.

Другі важны напрамак — патрыятычнае выхаванне: у планах арганізацыі значыцца стварэнне ў школах патрыятычных класаў. Падтрымку атрымлівае і валанцёрскі рух «Добрае сэрца». Акрамя таго, БРСМ спрыяе развіццю навукі і інавацыйных праектаў, пра што сведчыць конкурс «100 ідэй для Беларусі». Паспяхова наладжваецца супрацоўніцтва з міжнароднымі маладзёжнымі арганізацыямі і інтэграцыя ў еўрапейскую прастору.

Сёння ў актыве БРСМ — каля паўмільёна маладых людзей, якія рэалізуюць сябе ў розных сферах дзейнасці.

Кацярына РАДЗЮК

■ Грошы

«СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ» УЖО Ў БЮДЖЭЦЕ

Згодна з праектам закона аб рэспубліканскім бюджэце на 2015 год, расходы на зарплату, пенсіі, стыпендыі і іншыя трансферты насельніцтву запланаваны з ростам 18–20% у адносінах да ацэнкі бягучага года, аб гэтым паведаміла Міністэрства фінансаў.

У дакуменце таксама прадугледжваюцца расходы на ўхваленыя кіраўніком дзяржавы дадатковыя захады падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. Акрамя таго, у 2015 годзе захоўваюцца субвенцыі фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на пакрыццё расходаў па выплаце дзярждапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, у суме 2 трлн рублёў, што ў 1,5 раза перавышае субвенцыі 2014 года.

Паводле інфармацыі БЕЛТА

ФАКТЫ

ГАСПАДАРЫЦЬ — БЕЗ ШКОДЫ ДЛЯ ПРЫРОДЫ

У Магілёўскім раёне тром супрацоўнікам райаграпрамтэхнікі вынесены папярэджанні за парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства, у дачыненні да кіраўніка і юрасобы будзе ініцыяваны адміністрацыйны працэс.

— Патрулюючы акваторыю ракі Друць, работнікі Магілёўскай міжрайінспекцыі заўважылі, што каля вёскі Семукачы водаахоўная зона забруджана сцёкавымі водамі — адходамі вытворчасці мясцовай фермы. А каля вёскі Вялікія Бялевічы побач з ракой уладкаваны летні лагер для буйной рагатай жывёлы, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Непадалёку на сельскагаспадарчым полі механізатар убіраў кукурузу з парушэннем правілаў — ад краю да цэнтра. Такі спосаб можа прывесці да масавай гібелі дзікіх жывёл і птушак, якія могуць быць на полі (зайцаў, курапатак, цецерукоў і інш.), асабліва калі паша размешчана ў межах паляўнічых угоддзяў. Яшчэ напярэдадні летняга сезона дзяржінспектары накіроўвалі кіраўніцтву райаграпрамтэхнікі прадпісанне аб недапушчальнасці падобных дзеянняў. Цяпер як юрасобе, так і яго кіраўніку будуць прад'яўлены штрафныя санкцыі.

ПАМЁР, МЯНЯЮЧЫ ЛЯМПАЧКУ…

Удзень на тэрыторыі машынна-трактарнага парка ў вёсцы Церабуты Старадарожскага раёна адбыўся няшчасны выпадак: памёр чалавек.

Паводле інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, галоўны энергетык прадпрыемства, мужчына 1948 года нараджэння, праводзіў замену лямпачкі вулічнага асвятлення. І пайшоў з жыцця проста на апоры лініі электраперадач… Цела памерлага з вышыні давялося спускаць выратавальнікам, выклік якім паступіў з мясцовага РАУС. Праводзіцца расследаванне прычын і абставін здарэння.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБГОН ЗАКОНЧЫЎСЯ ТРАГЕДЫЯЙ

Адразу тры чалавекі загінулі ў дарожна-транспартным здарэнні, што адбылося ў Гомельскім раёне.

Каля вёскі Пясочная Буда сутыкнуліся фура «DAF» з прычэпам «BURG» і «Opel Astra», якія рухаліся ў сустрэчным кірунку. 42-гадовы кіроўца легкавіка, які, па папярэдняй версіі, выехаў на сустрэчную паласу, каб здзейсніць абгон, і дзве яго 40-гадовыя пасажыркі сканалі на месцы. Фура ехала з Казахстана ў Брэст без грузу, кіроўца не пацярпеў. Па гэтым факце следчае ўпраўленне УСК Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці завяло крымінальную справу. На працягу некалькіх гадзін следча-аператыўная група ў складзе супрацоўнікаў СК, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гомельскай вобласці, ДАІ і МНС высвятлялі акалічнасці трагедыі. Абодва аўтамабілі змешчаны на ахоўныя стаянкі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗА РУЛЁМ У КАСЦЮМЕ ПАДВОДНІКА АКАЗАЎСЯ БРАКАНЬЕР

У Кобрыне затрымалі аматара воднага палявання з уловам, які перавышаў усялякія нормы. Увагу праваахоўнікаў прыцягнуў мужчына, які ехаў за рулём у касцюме для падводнага палявання. Машыну спынілі, папрасілі адчыніць багажнік. Там знаходзілася 10 кілаграмаў рыбы. Як заўважыў супрацоўнік Брэсцкай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Дзмітрый РЫБАКОЎ, улоў аматара за суткі не можа перавышаць пяці кілаграмаў. Калі больш, гэта незаконна. А гора-паляўнічы прабіваў самоў, лінёў, шчупакоў, судакоў наскрозь стралой падводнага ружжа па прынцыпе: чым больш, тым лепш.

Справай займаецца Кобрынскі аддзел СК; калі віна маладога чалавека будзе даказана, ён панясе крымінальную адказнасць. Акрамя таго, мусіць выплаціць каля 14 мільёнаў рублёў у якасці кампенсацыі ўрону, нанесенага прыродзе.

Яна СВЕТАВА.

■ Будзе свята!

УЗГАДАЦЬ ГІСТОРЫЮ І ЗАНЯЦЦА СПОРТАМ

ЯКІ АДПАЧЫНАК ПРАПАНУЮЦЬ МІНЧАНАМ НА ДЗЕНЬ ГОРАДА?

«Разынкамі» Дня горада сёлета стануць два мерапрыемствы — біятлонны фестываль Дар'і Домрачавай і «Мінск гістарычны». Пра гэта паведаміла першы намеснік кіраўніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі, кіраўнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віталіна РУДЗІКАВА.

Сёлета Мінску спаўняецца 947 гадоў, і ўжо традыцыйна ў другую суботу верасня ў сталіцы адзначаюць Дзень горада. «Прытрымліваючыся канцэпцыі Года гасціннасці, свята будзе турыстычна скіравана, што дазволіць падкрэсліць прыгажосць Мінска і яго турыстычны патэнцыял, — адзначыла Віталіна Рудзікава. — Субота 13 верасня стане асноўным днём святкаванняў. У цэнтральнай частцы горада і раёнах плануецца правесці каля 50 мерапрыемстваў рознага кірунку. Напрыклад, мы падвядзём вынікі конкурсаў «Мінскі майстар», «Мінчанін года».

Фестываль «Мінск гістарычны» адбудзецца ў зялёнай зоне на скрыжаванні праспектаў Пераможцаў і Машэрава. Віталіна Рудзікава адзначыла, што ў свяце прымуць удзел многія клубы па рэканструкцыі, якія ў сваіх выступленнях ахопяць дзесяць стагоддзяў беларускай гісторыі. Падзеі, якім надаецца асаблівая ўвага — вайна 1812 года і 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Парк Перамогі запрашае на выстаўку-кірмаш «Горад майстроў», дзе можна будзе не толькі набыць прадукцыю, але і самому паўдзельнічаць у майстар-класах.

На адкрытай пляцоўцы каля Палаца спорту ў гэты дзень пройдзе фестываль мастацтваў беларусаў свету, на якім выступяць творчыя калектывы з 15 краін. Пасля яго адбудзецца канцэрт «Мелодыі нашага горада». Таксама будзе працаваць выстаўка прамысловай тэхнікі сталічных прадпрыемстваў.

Распрацавана асобная праграма для дзяцей і падлеткаў. У гарадскім парку імя Горкага адбудзецца фестываль біятлону Дар'і Домрачавай. На пляцоўцы каля аквапарка Лебядзіны разам збяруцца дзеці са шматдзетных сем'яў, адораныя дзеці (усяго каля 500 чалавек) — на свята «Мары спраўджваюцца». Яны змогуць бясплатна скарыстацца паслугамі аквапарка.

Як заўважыла Віталіна Рудзікава, будзе многа спартыўных мерапрыемстваў: адбудуцца гарадскія спаборніцтвы па тэхніцы воднага турызму «Свіслач-2014», па сілавым экстрыме, забег на ролікавых каньках, лёгкаатлетычны марафон.

Не застанецца без увагі і моладзь: у Студэнцкай вёсцы з 18 да 22 гадзін пройдзе канцэрт «У рытме сталіцы», на якім выступяць прафесійныя і маладыя творчыя калектывы. Ужо вядомы хэдлайнер — гурт «Без білета».

Традыцыйная цырымонія ўскладання кветак да абеліска «Мінск — горад-герой» адбудзецца ў 21.30. Пасля яе мінчан чакае святочны феерверк.

На Дзень горада запланавана адкрыццё новых сацыяльна-значных аб'ектаў, сярод якіх спартыўны комплекс у мікрараёне Сухарава, жылыя дамы для шматдзетных сем'яў, 39-я гарадская паліклініка, культурна-аздараўленчы цэнтр Фрунзенскага раёна, помнік ахвярам фашызму на Чыжоўскіх могілках.

«На васьмі ўчастках Мінска будзе ажыццяўляцца прапускны рэжым, — распавёў **кіраўнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр КУПЧЭНЯ.** — Узмоцнены кантроль чакае жыхароў сталіцы на набярэжнай ракі Свіслач, у чатырох месцах вакол стэлы «Мінск — горад-герой», пляцоўцы каля Палаца спорту і Студэнцкай вёскі, у Верхнім горадзе. У Цэнтральным парку Горкага плануецца правядзенне візуальнага выбарачнага агляду».

Гарадскі транспарт будзе працаваць у звычайным рэжыме.

Кацярына РАДЗЮК

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

Опубликованной 25 февраля 2014 г. в газете «Звязда»
по объекту Многоквартирный жилой дом не повышенной комфортности №3 по генплану с помещениями общественного назначения, подземной автостоянкой в квартале улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко, П. Глебки (продолжение) в г. Минске.

Общество с ограниченной ответственностью «Антасам» информирует о дополнении к проектной декларации объекта долевого строительства, опубликованной в газете «ЗВЯЗДА» № 35 от 25 февраля 2014 г.:

Внести следующие дополнения:

Абзац «Для привлечения физических, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагаются:» дополнить:

1 (Одно) помещение общественного назначения на 2-ом этаже в секции Г. Цена 1 м.кв. общей площади помещений общественного назначения в текущих ценах на момент опубликования проектной декларации составляет 18 810 000 (Восемнадцать миллионов восемьсот десять тысяч) белорусских рублей с НДС эквивалентной 1 800 долларам США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 05 сентября 2014 г.

1 (Одно) помещение общественного назначения на 2-ом этаже в секции Д. Цена 1 м.кв. общей площади помещений общественного назначения в текущих ценах на момент опубликования проектной декларации составляет 18 810 000 (Восемнадцать миллионов восемьсот десять тысяч) белорусских рублей с НДС эквивалентной 1 800 долларам США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 05 сентября 2014 г.

УНП 100727641

ГП «Институт НИИСМ»
сообщает, что 07.10.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Минина, 23
СОСТОИТСЯ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ
пылемера пробоотборного D-RC80.
Начальная стоимость 182 034 614 рублей.
Сумма задатка — 1%, шаг аукциона — 5%.
Срок подачи заявлений (внесения задатка) — до 06.10.2014 г.
Дополнительная информация по тел. (017) 226 25 95.
УНП 100122953

ЗНАЙСЦІ ШЛЯХ ДА ЧЫТАЧА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Сёлета па ініцыятыве міністэрства ўпершыню па ўсёй краіне прайшла акцыя «Лета з добрай кнігай», у якой браў актыўны ўдзел і Выдавецкі дом «Звязда». Што б вы назвалі яе асноўным вынікам? Ці будзе яна мець працяг у далейшым?

— Безумоўна, калі задумвалі гэту акцыю, да якой актыўна падключыліся і Мінгарвыканкам, і аблвыканкамы, і вядучыя выдавецтвы краіны, мы разлічвалі на тое, што яна будзе маштабнай і атрымае шырокі рэзананс. Звярнуць увагу дарослых на праблему чытання, дапамагчы дзецям правесці цікавыя і карысныя канікулы з добрымі цікавымі кнігамі — вось што было асноўнай мэтай. Акцыя прайшла ва ўсіх рэгіёнах краіны, яе ўдзельнікі пабывалі ў школах, бібліятэках, летніх лагерах адпачынку. У вачах хлопчыкаў і дзяўчынак мы бачылі сапраўдную зацікаўленасць і захапленне, калі яны гарталі кнігі, што прывозілі для іх удзельнікі акцыі. Аднойчы адкрыўшы дзівосны свет чытання, гэтыя дзеці на ўсё жыццё зразумеюць, што кніга можа стаць добрым сябрам і дарадчыкам, і наўрад ці яны з гэтым разуменнем захочуць развітацца. Вось гэта і ёсць, бадай што, галоўны вынік нашай акцыі. Плён ад яе ёсць, і значны, таму падобныя акцыі мы будзем праводзіць і надалей, і не толькі ўлетку.

— Сярод літаратуры і перыёдыкі, што выходзіць у Беларусі, нават самы спакушаны чытач знойдзе цікавае і патрэбнае. Але побач яшчэ адзін вялізны выдавецкі рынак — Расія. За кошт чаго, на ваш погляд, нашым выдаўцам удаецца вытрымліваць канкурэнцыю, і ці патрэбныя нейкія цэнтралізаваныя захады, каб абараніць айчынных вытворцаў?

— Абараняць айчынных вытворцаў? Калі вы маеце на ўвазе літаратараў, то, на маю думку, ніякія штучныя меры не дапамогуць у стварэнні сапраўднай літаратуры. Згадзіцеся, гэта найпершая ўмова, каб пэўнага аўтара «шукалі» ў кнігарні. Разам з тым, мы не ўяўляем сябе без вялікай рускай літаратуры. Менавіта таму ў нашых крамах шмат расійскай кнігі. Іншая справа, трэба больш актыўна прапагандаваць нацыянальныя праекты і літаратуру. Найперш ім трэба, на маю думку, адводзіць у кнігарнях цэнтральныя месцы. Галоўнае, каб з кнігай і патэнцыяльным яе пакупніком, чытачом, працавалі — і ў бібліятэках, і ў кніжных крамах, і ў студэнцкіх аўдыторыях. Наогул, павінна весціся вялікая сістэмная праца па папулярызацыі кнігі і чытання. І тут шмат рэзерваў. Асабліва ў дзейнасці пісьменнікаў і выдавецтваў.

— Ва ўсім свеце існуе сёння надзвычай важная для аўтараў і выдаўцоў праблема: абарона правоў у віртуальнай прасторы. Літаратурнае пірацтва са з'яўленнем электронных кніг стала гэткім самым модным і запатрабаваным, як і відэа, і музычнае. Якія меры прымаюцца ў нашай краіне, каб пісьменнік або журналіст, размясціўшы свой твор у інтэрнэце, мог быць упэўненым, што плён яго працы не спампуюць бясплатна без яго ведама, не скарыстаюць пад чужым аўтарствам?

— Сучасныя рупліўцы мастацкага і публіцыстычнага слова сёння стаяць перад дылемай: выкласці свае творы ў інтэрнэт, тым самым здабыўшы для іх новых чытачоў, але стаўшы пры гэтым патэнцыяльнай ахвярай піратаў, або застацца без віртуальнай версіі сваёй творчасці і шукаць іншыя формы папулярызацыі сваёй працы, але нікому не даць магчымасці на ёй нажыцца. Выбіраюць, як правіла, першы варыянт, бо больш хуткага і маштабнага сродку распаўсюджвання інфармацыі яшчэ не прыдумалі. Але, калі гаварыць пра інтэрнэт як частку інфармацыйнай прасторы, то тут, безумоўна, павінны дзейнічаць усе нормы заканадаўства, у тым ліку і аб аўтарскім праве.

— І ўсё ж, у якім бы варыянце ні выходзіў твор — у папяровым ці электронным, непасрэдны кантакт — вочы ў вочы — аўтара і чытача і сёння не страчвае сваёй актуальнасці. Дзень беларускага пісьменства дае такую магчымасць усім ахвотным ва ўсіх рэгіёнах, балазе, геаграфія свята шырокая. Сёлета гасцей трэба чакаць значна больш — Заслаўе зусім побач з Мінскам. Ці ўлічвалі гэта ў сцэнарыі свята, каб зацікавіць сталічнага гледача?

— Стала добрай традыцыяй сталіцамі свята беларускага пісьменства вызначаць тыя гарады, якія ў гісторыі, асветы і духоўнасці беларускага народа маюць непасрэднае дачыненне. Сёлета другі раз свята прымае старажытнае Заслаўе, якое разам з Полацкам і Тураваm можна назваць калыскай беларускай дзяржаўнасці і духоўнасці. Сама атмасфера горада, які захоўвае подых гісторыі, спрыяе правядзенню такога свята.

Нацыянальным Аргкамітэтам, які, дарэчы, узначальвае намеснік Прэм'-ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатолій Афанасьевіч Тозік, вырашана правесці адкрыццё Дня беларускага пісьменства вечарам 6 верасня. Спадзяюся, яно будзе вельмі прыгожым і незвычайным, але ўсіх сакрэтаў раскрываць не буду. Скажу толькі, што ў гасцей і ўдзельнікаў свята будуць усе магчымасці далучыцца да беларускага пісьменства, літаратуры, адчуць прыгажосць мастацкага слова. А таксама тое, што беларуская мова знітавана з іншымі славянскімі мовамі — рускай, украінскай — глыбокімі гістарычнымі каранямі. Заслаўе зусім недалёка ад сталіцы, таму, калі хочаце правесці з сям'ёй цікавыя і пазнавальныя выхадныя,— прыязджайце, не пашкадуеце!

— На працягу стагоддзяў у беларусаў пісьменства атаясамлівалася з духоўнасцю. На вашу думку, у наш час гэта тоесна сць захоўваецца?

— Несумненна. Гэта пры тым, што з імклівым развіццём сучасных тэхналогій магчымасці дзейснасці напісанага слова павялічылася ў разы: мы бачым, якую ролю адыгрываюць сёння сродкі масавай інфармацыі, інтэрнэт у сусветнай палітыцы, эканоміцы. Але я цвёрда перакананa, што ў нашых чытачоў сярод мільёнаў напісаных слоў на першым месцы будуць тыя, што сведчаць аб любові да Радзімы, сваіх вытокаў і каранёў, паважлівым стаўленні да суседзяў. У нашай гісторыі на працягу стагоддзяў было менавіта так. І гэта тая спадчына, той каштоўны набытак, адрачыся ад якога нам не дазволяць памяць і сумленне.

Пытанні задавала Алена ЛЯЎКОВІЧ.

■ Класныя навіны

АД ЗАХАПЛЕННЯ І ГУЛЬНІ — ДА ПРАФЕСІІ

Сумесныя маладзёжныя інавацыйныя пляцоўкі — аб'яднанні па інтарэсах тэхнічнага і прыродазнаўча-матэматычнага профілю — будуць ствараць ва ўсіх рэгіёнах на базе ўстаноў адукацыі. Кіраўнікі Міністэрства адукацыі і Міністэрства сувязі і інфарматызацыі падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве двух ведамстваў у гэтым пытанні.

— Асноўная мэта такіх аб'яднанняў — павысіць якасць навуковай, тэхнічнай, інавацыйнай і адукацыйнай дзейнасці ў галіне прыродазнаўчых і дакладных навук: інфарматыкі, фізікі, радыёэлектронікі і робататэхнікі, абудзіць у школьнікаў цікавасць да даследчай, рацыяналізатарскай і вынаходніцкай дзейнасці,— тлумачыць **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.**— Спецыялісты будуць уцягваць моладзь у сферу вывучэння высокіх тэхналогій, мадэлявання, праектнай дзейнасці, ствараць сістэмы прафарыентацыйнай работы з навучэнцамі для матываванага выбару імі спецыяльнасцяў тэхнічнай сферы.

Па словах міністра адукацыі, супрацоўніцтва будзе скіравана на ўзмацненне практыка-арыентаванага і прыкладнога характару навучання дзяцей і падлеткаў, на выхаванне творчых асоб. Структура першага сумеснага праекта ўключае ў сабе два модулі — «Лега-парк» і «IT-акадэмію».

— Хацелася б узняць на новую вышыню якасць дадатковай адукацыі. З гэтай мэтай міністэрства будзе падтрымліваць стварэнне школ робататэхнікі ва ўсіх рэгіёнах,— дадаў міністр.

Цяпер такія школы ёсць у 6 сталічных установах адукацыі, а таксама ў Наваполацку. Дзеці вывучаюць там праграмаванне, 3D-мадэляванне, алгарытміку, механіку, асновы электронікі і мікрапрацэсарных сістэм, будову камп'ютара і праграмнае забеспячэнне, распрацоўку і стварэнне сайтаў, канструяванне, фізіку і матэматыку.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Конкурсы

Знімі ролік пра настаўніка і выйграй планшэт

15 верасня ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце стартуе конкурс відэаролікаў, прысвечаных працы настаўніка. Да ўдзелу ў ім запрашаюцца навучэнцы 9—11 класаў агульнаадукацыйных устаноў.

Старшакласнікам прапануецца зняць відэаролік па адным з пяці тэматычных напрамкаў: «Я хачу быць настаўнікам», «Роля настаўніка ў маім жыцці», «Настаўнік будучыні: які ён?», «Настаўніца першая мая» і «Няхай славіцца праца настаўніка ў стагоддзях».

Конкурсную работу трэба запісваць на DVD-дыск у агульнадаступных фарматах або можна размясціць яе на відэахостынгу YouTube (з адрасам спасылкі ў інтэрнэце). Працягласць ролікаў — ад 30 секундаў да 5 хвілін. Удзел у роліку непасрэдна яго аўтара не абавязковы.

Прыём і рэгістрацыя заявак ад удзельнікаў — з 15 верасня па 15 кастрычніка. Падвядзенне вынікаў з 15 па 25 кастрычніка. Узнагародай за першае месца стане планшэт, за другое — тэлефон і за трэцяе — электронная кніга.

Надзея НІКАЛАЕВА

З ХЛЕБАМ ДЫ САЛАМ

Кіраўск рыхтуецца стаць сталіцай «Дажынак-2014» для раёнаў Магілёўскай вобласці

Святочныя мерапрыемствы адбудуцца адначасова ў Кіраўску і аграгарадку Мышкавічы. Прычым пачнуцца яны 19 верасня раённымі «Дажынкамі» і закончацца 20-га абласнымі. На рэканструкцыю аб'ектаў сацкультбыту і жыллёвага фонду, а таксама добраўпарадкаванне тэрыторый выдаткавана, паводле інфармацыі Камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Магілёўскага аблвыканкама, амаль 82 мільярды рублёў. У тым ліку 20 мільярдаў з рэспубліканскага бюджэту.

Яшчэ 21 мільярд выдаткаваў лідар па жніве ў Кіраўскім раёне — СВК «Рассвет». За кошт гэтых сродкаў цалкам адновяць 11 шматкватэрных дамоў у Кіраўску, раённы Дом культуры, мышкавіцкі Дом культуры і шмат іншых будынкаў; яшчэ на шэрагу аб'ектаў вядзецца бягучы рамонт. Акрамя гэтага, у Кіраўску заменяць водаправодную сетку і пакладуць асфальт на 8 вуліцах. Яшчэ 9 вуліц заасфальтуюць у Мышкавічах. Падрыхтаваны і план культурных мерапрыемстваў.

— Мы чакаем гасцей на святы хлеба, сала, мёду, бульбы і рыбы,— паведаміў **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Кіраўскага раёна Андрэй КАРПУК.**— Запланаваны спартыўнае свята, выстаўка сельгастэхнікі, шматлікія канцэрты. Будуць працаваць сельгаспадворкі, конная школа, дзіцячыя атракцыёны. Я ўжо не кажу пра гандлёвыя рады, якіх будзе вельмі шмат.

З раёнаў вобласці ў Кіраўску чакаюць каля 600 афіцыйных гасцей, якія прыедуць у складзе дэлегацый. Дасланы запрашэнні першым асобам дзяржавы і вобласці, а таксама кіраўніцтву гарадоў-пабрацімаў з Бранскай і Белгародскай абласцей.

Між тым на Магілёўшчыне ў кожным райцэнтры святкуюцца свае асобныя «Дажынкі». У гэтую суботу перадавікоў віншуюць у Клічаўскім раёне. У аграгарадку Новыя Максімавічы разгорнецца кірмаш, у якім прымуць удзел аграпрамысловыя прадпрыемствы раёна і творчыя калектывы. Жыхары пазмагаюцца за званне «Мядовага караля» і «Уладара сяла», прымуць удзел у конкурсах-выставах на лепшую страву і хлебны каравай, прадэманструюць самыя буйныя ўзоры вырашчанай сваімі рукамі садавіны і гародніны.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Сардэчна запрашаем

СВЕТАМ КІРУЕ ТОЙ, ХТО... ЧЫТАЕ

У другі раз Заслаўе прымае Дзень беларускага пісьменства. Свята традыцыйна праводзіцца ў першую нядзелю верасня. Але сёлета яго праграма разлічана на два дні — 6 і 7 верасня.

Урачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства адбудзецца 6 верасня на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы каля Гарадскога вала. Па традыцыі, святкаванню папярэднічае **рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў»** з жыватворным агнём ад Гроба Гасподняга. Экспедыцыя стартуе з Мінска 3 верасня і прыбудзе ў Заслаўе 7 верасня. У храме Праабражэння Гасподняга адбудзецца літургія. На пляцоўцы перад святыняй будзе арганізавана выстава-продаж праваслаўнай і духоўнай літаратуры, а вернікі пасадзяць Сад Малітвы.

❍❍❍

У Нацыянальнай бібліятэцы 6 верасня пройдзе **міжнародны «круглы стол» на тэму «Сугучча: літаратура як люстэрка эпохі»**, у якім прымуць удзел беларускія і замежныя пісьменнікі, а таксама прэзентацыя альманаха «Сугучча». У ліку арганізатараў — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» .

У Заслаўі святочныя мерапрыемствы разгорнуцца на некалькіх пляцоўках. Напрыклад, на цэнтральнай плошчы горада адкрыецца **фестываль кнігі і прэсы**, дзе ўсе ахвотныя змогуць азнаёміцца з аўтарскім праектам «У пошуках страчанага» — выстаўкамі «Мінск. Падарожжа ў часе», «Імгненні Першай сусветнай вайны» Уладзіміра Ліхадзедава, газеты «СБ. Беларусь сёння» і РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», экспазіцыяй перыядычных выданняў. Тут жа будуць прадстаўлены экспазіцыя кніг-пераможцаў нацыянальнага і міжнароднага конкурсаў «Мастацтва кнігі», фотавыстаўка «Пераможцы». У гасцей і ўдзельнікаў свята будзе магчымасць пабачыць і дзеючы друкаваны станок XVI стагоддзя, і афортны станок пачатку XX стагоддзя, азнаёміцца са старажытным спосабам вытворчасці паперы, пагартаць Біблію Францыска Скарыны, надрукаваную па старажытных тэхналогіях. Падчас выстаўкі «Міншчына інфармацыйная» адбудуцца прэзентацыі рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі, бібліятэк і друкарняў. Вершы з новых кніг прачытаюць паэты Дзмітрый Марозаў («Вачыма сэрца»), Віктар Шніп («Першы папяровы снег», «Тутэйшая туга») і іншыя. Барыс Лазука прэзентуе сваю кнігу «Слуцкія паясы. Адраджэнне традыцый», якая выйшла ў выдавецтве «Беларусь».

❍❍❍

«Літаратурнае кафэ» прапануе конкурс эпіграм, бурымэ, літаратурныя віктарыны, «адкрыты марафон» для паэтаў. Тут жа пройдзе **акцыя «Чытай па-беларуску»**. Усе неабыякавыя да роднага слова змогуць сустрэцца з вядомымі беларускімі пісьменнікамі, паэтамі — юбілярамі 2014 года, паслухаць творы ў іх выкананні. Традыцыйна адбудзецца і ўшанаванне пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор года.

❍❍❍

Шмат мерапрыемстваў запланавана і для дзяцей, падлеткаў. У прыватнасці, **конкурс юных чытальнікаў Мінскай вобласці «Жывая класіка», падвядзенне вынікаў рэспубліканскай акцыі «Лета з добрай кнігай»**. Юныя грамадзяне змогуць пабываць на свяце «Чароўны свет дзяцінства», паўдзельнічаць у «Пернікавым фэсце» — святочным кірмашовым шэсці ў стылізаваных беларускіх строях, пазнаёміцца з персанажамі «Батлейкі», прайсці майстар-класы па розных дэкаратыўна-прыкладных тэхніках, паўдзельнічаць у пленэры «Расфарбуй мару», пабываць на выстаўцы малюнкаў «Новыя ілюстрацыі да старых любімых кніг». Свае кнігі для дзяцей прадставяць Анатоль Зэкаў, Сяргей Давідовіч, Яронімас Лаўцюс, Анатоль Бутэвіч.Тут жа адбудзецца прэзентацыя часопіса «Бярозка»: «Светам кіруе той, хто чытае», газеты «Зорька»: «Будучыня пачынаецца з мары».

У агульнаадукацыйнай школе №1 будзе працаваць выстаўка-прэзентацыя «Беларусь: гасціннасць без межаў», у школе мастацтваў — навукова-практычная канферэнцыя «Заслаўскія чытанні», у Доме культуры «Світанак» — выстаўкі «Янка Купала і тэатр», «Якуб Колас. Жыццё і творчасць».

❍❍❍

Сцэнічная пляцоўка ў цэнтры горада прапануе гістарычную **тэатралізаваную экспазіцыю «Заслаўскі дворык»**. Тут гасцей сустрэнуць «Жывыя скульптуры» — летапісцы, пісьменнікі, героі літаратурных твораў створаць імітацыю вуліцы эпохі Асветы. Праграма «Пад покрывам сівых стагоддзяў» прадставіць рыцарскую культуру, майстар-класы па сярэднявечных танцах.

❍❍❍

Асаблівасцю сёлетняга свята стане прэзентацыя аграсядзіб. Прадстаўнікі турыстычнага бізнесу раскажуць пра ўмовы адпачынку ў вёсцы і новых турыстычных комплексах. Турысты атрымаюць магчымасць прайсці новым распрацаваным кальцавым маршрутам, які ахоплівае асноўныя знакавыя месцы Заслаўя: Спаса-Праабражэнскі храм, Гарадскі вал, гістарычную частку горада.

❍❍❍

Падчас свята будуць працаваць выстаўка-продаж вырабаў майстроў народнай творчасці «Рамесніцкі гасцінец», крама «Беларускія прысмакі». Практычна ўсю рынкавую плошчу зоймуць гандлёвыя аб'екты, дзе можна будзе выпіць гарбаты, падсілкавацца чым-небудзь смачненькім, набыць неабходныя тавары. У тым ліку і школьныя, канцылярскія, паколькі свята праходзіць у пачатку верасня.

7 верасня ў 16 гадзін запланавана цырымонія перадачы эстафеты свята. Пасля чаго адбудзецца канцэрт, а для моладзі — дыска-акцыя «ДАНС БАТЛейка».

Нагадаю, Дзень беларускага пісьменства адзначаецца з 1994 года з мэтай прапаганды лепшых традыцый нацыянальнай культуры, друкаванага слова, духоўнасці беларускага народа. Традыцыйна свята праводзіцца ў гістарычных і культурных цэнтрах.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■ Год гасціннасці: вывучаем маршруты

ЧЫМ ЗАСЛАЎЁ СЛАЎНАЕ

Беларускае мястэчка набірае турыстычныя абароты

Заслаўе — адзін з чатырох гарадоў Беларусі, якія перасягнулі тысячагадовы рубеж. Менавіта гэтым у першую чаргу горад і прывабны для гасцей, бо драматычнасць некаторых старонак яго гісторыі не пакідае месца абыякавасці. А блізкасць да сталіцы робіць наведванне Заслаўя яшчэ і зручным. Прыехаць у горад Ізяслава і Рагнеды можна на ўласным аўто ці маршрутным таксі. Аматары здаровага ладу жыцця могуць скарыстацца веласіпедам. А для тых, хто любіць рамантычны грукат чыгуначных колаў, добра наладжаны рух электрычак і цягнікоў гарадскіх ліній.

Фота Дзяны СЕРАДЗЮК.

«Замэчак».

Горад міру

У Заслаўі пераплятаюцца не толькі гісторыя і сучаснасць, блізкасць да сталіцы і ціхае правінцыяльнае жыццё. З самага свайго заснавання горад спалучыў у сабе нязломную цвёрдасць і міласэрную пакорлівасць Рагнеды, і тут можна адчуць гэтую «дваістасць», якая прасочваецца хоць бы ў двух храмах, падобных, як браты, але такіх прынцыпова розных, ці ў гарадской забудове і самім ходзе жыцця па розныя бакі чыгункі. Горад палюбіўся гасцям з Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі. Не забываюцца на яго і самі беларусы. Статыстыка сведчыць пра штогадовае павелічэнне турысцкай плыні. Дзень пісьменства абяцае паставіць развіццё турызму ў горадзе на новы ўзровень. Да сустрэчы гасцей тут падышлі глабальна.

— У межах падрыхтоўкі да Дня пісьменства адбылася закальцоўка турыстычнага маршруту. Цяпер ён стаў вельмі зручным для турыста, — распавяла «Звяздзе» **старшыня Заслаўскага гарвыканкама Святлана КАРТАШОВА**. — З любой кропкі — ці гэта касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі, ці этнаграфічны комплекс, краязнаўчы музей або Спаса-Праабражэнская царква — па коле можна прайсці ўвесь гістарычны цэнтр. Апроч таго, маршрут уключае наведванне Дзіцячага музея міфалогіі і лесу.

Для зручнасці турыстаў маршрут мае некалькі зон адпачынку і месцы для фатаграфавання. Новыя зоны адпачынку з'явяцца і каля Спаса-Праабражэнскай царквы. Адпачыць можна будзе і каля штучнага вадаёма. А лава для закаханых, якая ўжо «заваявала» многія гарады свету і цяпер з'явілася ў Заслаўі, стане сапраўды знакавай кропкай: тут ёсць месца, дзе пары могуць пакінуць замочак свайго кахання і па ўжо сталай традыцыі кінуць ключ ад яго ў ваду і забыцца на яго, прарочачы сваім пачуццям вечнасць. З'явіца і зусім нетрывіяльная, аднак цалкам натуральная для такога горада, як Заслаўе, рэч — лава для прымірэння. Ёсць у гэтым штосьці сімвалічнае: як-ніяк, сваім заступніцтвам за маці малалетні Ізяслаў здолеў утаймаваць раз'юшанага бацьку Уладзіміра, які не пакараў смерцю жонку за замах на яго, а адаслаў жыць на родную крывіцкую зямлю. Хто ведае, можа, аднаму з найстаражытнейшых мястэчкаў Беларусі наканавана стаць сусветным горадам міру?..

З любой кропкі — ці гэта касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі, ці этнаграфічны комплекс, краязнаўчы музей або Спаса-Праабражэнская царква — па коле можна прайсці ўвесь гістарычны цэнтр.

Новымі цікавымі аб'ектамі сталі каменныя скульптуры і каваныя крэслы каля краязнаўчага музея. На думку старшыні гарвыканкама, яны будуць запрашаць любога наведвальніка — госця горада ці мясцовага жыхара — спыніцца, задумацца пра жыццё, пра каханне, пра будучыню, сучаснасць і, безумоўна ж, мінулае. Апроч каменных скульптур, горад упрыгожыць алея з драўляных малых архітэктурных формаў.

Тут непаўторны дух гісторыі

Сваімі замкамі і палацамі вядомыя Мір, Нясвіж, Навагрудак, Крэва і іншыя беларускія гарады і мястэчкі. У Заслаўі ж складана засяродзіць увагу на адным аб'екце. Своеасаблівай візітнай карткай горада стане новы помнік князю Ізяславу ў гістарычным цэнтры, пераканана Святлана Карташова. Аднак сюды прыязджаюць не толькі дзеля архітэктурных ці нейкіх іншых матэрыяльных каштоўнасцяў. Гасцей у Заслаўе вабіць непаўторны дух гісторыі. І хоць няма тут шыкоўных княжацкіх рэзідэнцый, затое ёсць мілы і ўтульны нават сваёю назваю «Замэчак» — першае паселішча X стагоддзя, дзе калісьці жыла княжна Рагнеда — Гарыслава ў замужжы за князем Уладзімірам і Анастасія ў манастве. Дарэчы, ёсць меркаванне, што аб гэтым эпізодзе жыцця непакорнай дачкі Рагвалода нагадвае назва рэчкі Чарніцы, якая цячэ каля гарадзішча.

Апроч невысокіх узгоркаў «Замэчка», ёсць у Заслаўі і больш магутныя замкавыя валы. Яны ўзвышаюцца ў цэнтры горада. Тут у XVI—XVII стст. на месцы ўмацаванняў канца XI стагоддзя, магнатамі Глябовічамі быў пабудаваны бастыённы замак. Там жа Ян Глябовіч, які заснаваў у горадзе пратэстанцкую абшчыну, пабудаваў кальвінскі збор. Пазней ён быў пераасвечаны ў каталіцкі храм у гонар Святога Міхаіла-архангела. Цяпер былы збор — праваслаўная царква Праабражэння Гасподняга, дзверы якой і сёння адчынены для вернікаў і экскурсантаў. Яшчэ адзін заслаўскі храм — касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі, пабудаваны ў XVIII стагоддзі, — таксама дзейнічае і прымае наведвальнікаў.

У горадзе варта зазірнуць у краязнаўчы музей. І нават не зазірнуць, а дасканала яго агледзець — тут ёсць шмат прывабнага. Напрыклад, габелены, створаныя беларускімі мастакамі паводле матываў полацкай і заслаўскай гісторыі. Ёсць цікавая экспазіцыя музычных інструментаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Скрыпкі, гармонікі, бубны, шархуны можна не толькі ўбачыць, але і паслухаць іх гучанне — праўда, толькі ў запісе. У фондах музея захоўваецца найбуйнейшая ў краіне калекцыя шэдэўраў беларускага наіўнага мастацтва — маляваных дываноў, сабраная супрацоўнікамі з усёй Беларусі. У тым ліку тут можна пабачыць работы славутай майстрыхі са Случчыны Алены Кіш, таямнічая асоба якой (як і, уласна, работы) заварожвае. З творамі мастачкі тут суседнічаюць шэдэўры ўніверсальнага таленту Язэпа Драздовіча — яшчэ дасканала не вывучанага і да канца не прызнанага «беларускага Леанарда».

У фондах музея захоўваецца найбуйнейшая ў краіне калекцыя шэдэўраў беларускага наіўнага мастацтва — маляваных дываноў, сабраная супрацоўнікамі з усёй Беларусі.

Фота Надзеі БУЖАН.

Этнаграфічны комплекс — куточак сялянскай культуры.

Апошнія штрыхі — за часам

Акрамя спадчыны магнатаў, мастакоў і навукоўцаў, у Заслаўі здолелі захаваць і невялікі астравок сялянскай культуры. Недалёка ад валоў функцыяную этнаграфічны комплекс, дзе кожнаму ахвотнаму пакажуць стары паравы млын (у працоўным выглядзе захаваўся ён адзіны з больш чым трох соцень у нашай краіне), свіран, кузню (яшчэ не так даўно тут працавала адзіная ў Беларусі жанчына-каваль), і хату завозніка (своеасаблівыя «апартаменты» для тых, хто прывозіў зерне на памол), дзе адноўлены сялянскі побыт пачатку мінулага стагоддзя.

Не толькі дзецям, але і дарослым цікава будзе пабываць у мясцовым музеі міфалогіі і лесу і пабачыць ваўкалакаў, дамавікоў, вужыную каралеву... Па словах супрацоўнікаў краязнаўчага музея, у Дзіцячым музеі міфалогіі і лесу ладзяцца анімацыйныя экскурсіі з удзелам казачных персанажаў.

Пакуль не ўсё яшчэ дасканала ў гарадской навігацыі і турыстычнай інфраструктуры Заслаўя. Гістарычны цэнтр раствараецца ў сумным сваёй побытавасцю прыватным сектары — зрэшты, тут усё побач, і такое размяшчэнне культурна-гістарычных аб'ектаў нават мае сваю «разыначку». Было б някепска арганізаваць установы харчавання і пункты продажу сувеніраў у гістарычнай частцы горада. Бо мясцовая кавярня «Шынок» гатова абслугоўваць гасцей толькі па папярэднім заказе, а страўня «Гасцінец» працуе з 12 гадзін дня. Зрэшты, смачна і паўнавартасна паесці можна па іншы бок чыгуначнага пераезду ў кавярні «Сядзіба», аднак да яе трэба яшчэ дабрацца... Што да сувеніраў з мясцовым каларытам, то (і гэта агульная праблема ўсіх беларускіх гарадоў) іх выбар даволі невялікі, і знайсці іх можна хіба што ў музеях. А між тым ідэі для «сувеніркі» падказвае сама гісторыя — грунтуючыся на ёй, можна ўвесь горад апавіць легендамі, якія знайшлі б матэрыяльнае ўвасабленне не толькі ў выглядзе скульптур, але і маленькіх статуэтак, магнітаў, бірулек, паштовак... Хочацца верыць, што гэта ўсё — справа часу.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

НАШ ЛЕПШЫ СЯБАР

Роўна тры месяцы вандравала па краіне рэспубліканская акцыя «Лета з добрай кнігай». Пачаўшыся 1 чэрвеня, у адзін дзень з летнімі канікуламі, яна завітала ў самыя розныя мясціны Беларусі, дзе адпачывалі дзеці. Акцыя скончылася, вынікі падведзены. Цяпер дакладна вядома: восенню лічаць не толькі куранят, але і... новых маленькіх чытачоў!

Неабходнасць правесці акцыю, галоўны герой якой — кніга, была зразумелая даўно: апошняе дзесяцігоддзе папяровай сяброўцы даводзіцца змагацца з маладымі і на першы погляд больш прагрэсіўнымі канкурэнтамі — камп'ютарамі, планшэтамі, мабільнымі тэлефонамі. Фармат акцыі выбралі просты — сустрэча з маленькімі чытачамі, а вось формы атрымаліся самыя розныя: знаёмства з пісьменнікамі, казачнымі героямі, гульні ў жанры квэсту, інсцэніроўкі вядомых казак.

«Мы яшчэ раз пераканаліся, што нашы дзеці вельмі любяць чытаць. Дарослыя павінны толькі дапамагчы ім зразумець значнасць гэтага чытання», — дзеліцца назіраннямі **Алена СТЭЛЬМАХ, намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда»**. Алена Анатольеўна разам з камандай пісьменнікаў і прадстаўнікоў Міністэрства інфармацыі і выдавецтваў усё лета вандравала па дзіцячых летніках краіны. Яна сустракалася з чытачамі ў бібліятэках, школах, дамах культуры, на адкрытых пляцоўках, на цэнтральных плошчах гарадоў. «Больш за ўсё мяне здзівіў творчы падыход людзей, якія дапамагалі арганізоўваць мерапрыемствы на месцах. Яны паказалі дзецям, наколькі кніга шматгранная і цікавая», — дзеліцца ўражаннямі Алена Стэльмах.

Галоўны вынік акцыі не колькасць летнікаў, у якія творчая група прывезла кніжнае свята, і нават не мноства новых кніг, што занялі свае месцы на паліцах бібліятэк, але тое, што з добрай кнігай маленькія чытачы правядуць цяпер і восень, і зіму, і, спадзяёмся, усё сваё далейшае жыццё.

Любоў БЯЛЯЕВА.
Фота аўтара.

У горадзе Беразіно кніжка «выйшла на прагулку» ў цэнтральны парк.

Пісьменніца Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ прынесла ў аздараўленчы летнік «Папараць» сапраўдныя касмічныя цуды.

- Больш за 1500 дзяцей з усёй краіны прынялі ўдзел у акцыі.

- **Каля 1000 кніг, надрукаваных у Выдавецкім доме «Звязда», папоўнілі фонды раённых бібліятэк.**

- 30 паэтаў, пісьменнікаў, кнігавыдаўцоў усё лета знаёмілі маленькіх чытачоў з кніжнымі навінкамі.

- **18 кніжных свят для дзяцей адбылося ў краіне.**

Патрыятычная тэматыка акцыі ў аздараўленчым летніку «Лідар» у пасёлку Ждановічы нагадала дзецям пра тых, хто падараваў ім мірнае неба.

Трэці год запар у летніку «Спадарожнік» забаронены мабільныя тэлефоны. Электронныя дэвайсы замянілі верныя сябры — кнігі.

ГАВОРАЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ АКЦЫІ

Уладзіслаў ЦЫДЗІК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па аграрнай палітыцы:

— Лета з добрай кнігай» — цудоўная акцыя, накіраваная на выхаванне дзяцей, іх развіццё. Паклапоцімся пра падрастаючае пакаленне — атрымаем адукаваных дарослых, добрую апору дзяржавы.

❍ ❍ ❍

Святлана СІТНІКАВА, намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын:

— Кніга будзе існаваць заўсёды. Проста яна набывае сучасныя формы. Я часта бачу ў грамадскім транспарце маладых людзей з кнігамі. Таму казаць, што кніг не чытаюць — няправільна.

❍ ❍ ❍

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ, дзіцячая пісьменніца:

— Менавіта тады, калі дзеці адпачываюць, у іх больш часу, каб узяць у рукі кнігу, разгледзець яе, пачытаць. Звычайна лета — перыяд спакою для пісьменніка. Але толькі не тады, калі гэта «Лета з добрай кнігай».

❍ ❍ ❍

Генадзь АЎЛАСЕНКА, дзіцячы пісьменнік:

— Вельмі запомнілася мерапрыемства ў сталічным парку Горкага. Якраз тады толькі выйшла мая кніга «Ветрык і Пацучыны кароль», я змог добра прэзентаваць яе сваім чытачам. Такую ж магчымасць атрымалі і іншыя пісьменнікі падчас падарожжа з акцыяй.

Скульптар Аляксандр ПРОХАРАЎ:

«Зрабіць князя Ізяслава для мяне было справай гонару»

ПРА АБУДЖЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ, МАНУМЕНТАЛІЗМ І САПРАЎДНЫХ ТВОРЦАЎ

Майстэрня скульптара Аляксандра Прохарава знаходзіцца там жа, дзе калісьці працавалі Заір Азгур і іншыя вялікія манументалісты. Будынак створаны спецыяльна для мастакоў яшчэ ў 1928 годзе. Ён і дагэтуль выкарыстоўваецца па сваім першасным прызначэнні, але, сёння ўжо з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Унутры збудавання столь такая высокая, што, здаецца, можна выкурыць хоць цэлы пачак цыгарэт, якія так любіць Прохараў, і ўсё адно паху дыму не будзе чуваць — яму ёсць дзе лунаць у прасторы…

…У майстэрні, паміж шматлікімі бюстамі, ляжаць дыскі Metallica, Nick Kave, беларускага гурта Gogs Tower. Недалёка стаяць узмацняльнік і дзве гітары, акустычная і электронная. Аляксандр Прохараў нават сыграў некалькі ўласных кампазіцый для карэспандэнтаў «Звязды». Прызнацца, мы былі ўражаны іх якасцю. А сам мастак адзначыў, што калі б не стаў скульптарам, то, пэўна, быў бы музыкам. Ды і цяпер з сябрамі зрэдку выступае ў клубах. А каб не пастаянная праца над скульптурамі, адважыўся б на зборнік уласнай музыкі.

Паколькі наш тэкст рыхтаваўся спецыяльна да Дня пісьменства, мы не маглі не запытацца, ці чытае Прохараў беларускую літаратуру? Аказалася, яго любімы паэт — Алесь Разанаў, асабліва адгукаецца ў сэрцы зборнік «Вастрыё стралы». Падабаюцца яму таксама Уладзімір Караткевіч і Васіль Быкаў. Аднак найперш нас, вядома, цікавіла гісторыя стварэння помніка князю Ізяславу, урачыстае адкрыццё якога сёння адбываецца ў Заслаўі.

— Аляксандр, князь Ізяслаў уяўляўся мне 7-гадовым хлапчуком, які трымае ў руках меч і смела заступаецца за сваю маці. Аднак вы паказалі яго як магутнага статнага ваяра. Чаму менавіта такім вам убачыўся Ізяслаў?

— Усё-такі гэта помнік князю, які памёр ужо дарослым — па розных звестках, ад 25 да 31 года. Да таго ж князь — гэта той чалавек, які павінен трымаць зброю ў руках, умець думаць, умець кіраваць. Нашчадкі запомнілі яго як князя-кніжніка, які распаўсюджваў кнігапісанне па ўсёй краіне (таму ў руках Ізяслава — кніга. — **Аўт.**). Гэта было вынікам таго, што ён сын сваёй маці Рагнеды, якая была першай манашкай ва ўсходнеславянскіх землях і заснавала першы манастыр у горадзе, які на той час называўся Ізяслаўль. І тое, што ён стаў паміж маці і бацькам і хацеў адпомсціць яму, таксама сведчыць пра мужнасць гэтага чалавека.

— Ваша дыпломная праца ў Акадэміі мастацтваў была прысвечнана бітве на Нямізе. Таксама вы рабілі скульптуры Кірылы Тураўскага, Усяслава Чарадзея… Чым абумоўлены такі інтарэс да гістарычнай тэматыкі?

— Я вучыўся ў гімназіі-каледжы мастацтваў імя Ахрэмчыка, а там рабіўся ўхіл не толькі на выяўленчае мастацтва, але і на гісторыю і іншыя гуманітарныя прадметы. Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Паліна Наскова асабліва моцна на мяне паўплывала… Да таго ж у нашым мінулым вельмі шмат белых плям. Войны здараліся практычна кожныя 40–50 гадоў, пакідаючы пасля сябе спусташэнне. Калісьці гэта была краіна замкаў, а цяпер іх можна пералічыць па пальцах. Таму я і мае калегі якраз робім справу аднаўлення нацыянальнай самасвядомасці. Чалавек можа прыйсці і ўбачыць створаныя намі вобразы волатаў і пачаць ганарыцца тымі людзьмі, што жылі на гэтай зямлі, можа нарэшце зразумець, што і ў нас было сваё мінулае з яскравымі постацямі.

— Наколькі ахвотна мясцовыя ўлады ідуць на ўстаноўку помнікаў легендарным ваярам і дзеячам мінулага?

— Гэта іх ініцыятыва, цалкам. Да таго ж ладзяцца спецыяльныя конкурсы, каб выявіць лепшую работу такога кшталту.

— Значыць, можна лічыць, што не толькі вы і вашы сябры-мастакі, але і ўся краіна ідзе па шляху аднаўлення нацыянальнай самасвядомасці?

— Так. Тым больш гэта важна і для развіцця турызму: калі прыязджае замежнік, яму хочацца бачыць, чым гэта краіна адрозніваецца ад іншых — для гэтага яго найперш вядуць да помнікаў.

— Як вы ствараеце выявы асоб, якія жылі амаль тысячу гадоў таму? Зразумела, ніякія фотаздымкі, малюнкі, гравюры, па якіх можна было б аднавіць знешні выгляд, не захаваліся…

— Як гэта адбываецца, я не ведаю, але кожны мастак адчувае ў сэрцы сваім, калі ён «трапіў у дзясятачку» і зрабіў тое, што трэба. Тут, безумоўна, прысутнічае пэўнае натхненне звыш. Дарэчы, эскіз скульптуры Ізяслава я зрабіў сем гадоў таму.

— Стварылі Ізяслава яшчэ раней, па ўласным жаданні?

— Так. У мяне бабуля і бацька з Заслаўя. Таму для мяне гэта было вельмі важна.

— Якія тэматычныя кірункі распрацоўваеце, акрамя гістарычнага?

— Пастаянна ляплю з натуры: і сяброў, і проста так. Гэта як спартсмен — трэба ўвесь час падтрымліваць форму. Спачатку ляплю з пластыліну, толькі затым адліваецца форма — справа гэта не хуткая. Сапраўдны прафесіянал у розных напрамках мастацтва можа пакінуць свой след. Нядаўна я зрабіў скульптуру да 50-годдзя прадпрыемства «Шкловалакно». Прайшоўся па вытворчасці, убачыў увесь працэс і стварыў іх сімвал. Называецца «Нараджэнне» — у ім, калі быць уважлівым, праглядаецца постаць жанчыны.

— Галоўнае — знайсці пэўную метафару?

— Здаецца, сёння ў нашым грамадстве людзі пачынаюць разумець, хто мы і адкуль. Спачатку чалавеку трэба паесці, затым апрануцца, і толькі пасля сваё жыццё неяк упрыгожыць. Таму мастацтва ўсё ж ідзе пасля іншых асноўных патрэб.

— Значыць, нягледзячы на сусветныя віхуры і эканамічныя крызісы, наша нацыя нарэшце зацікавілася нечым большым?

— Так, пэўная духоўная запатрабаванасць цяпер ёсць.

— Калі гаварыць увогуле пра манументальнае мастацтва, ці знаходзіць яно сабе месца ў сучасным свеце тэхналогій?

— Вядома, гэта нават спрыяе. З сучаснымі тэхналогіямі скульптуру можна зрабіць хутчэй. Да таго ж скульптура цяпер часта пераходзіць у архітэктуру. Людзі паездзілі па іншых краінах, нешта ўбачылі; калі раней скульптура асацыявалася з помнікам на могілках або выключна з Леніным ці Калініным, то цяпер уяўленне грамадскасці змянілася. Таксама і мастакі многае пераасэнсавалі: напрыклад Уладзімір Жбанаў колькі зрабіў для таго, каб паказаць, што скульптура можа жыць у прасторы горада. Можна па-рознаму ставіцца да яго работ, але ён гэтую ролю выканаў менавіта для Беларусі.

— Мне здаецца, Жбанаў здзейсніў сапраўдны прарыў. Прыгадайце, калі ласка, якім ён быў пры жыцці?

— Жбанаў быў вельмі жывым чалавекам: як своеасаблівы тэатр аднаго акцёра. Мне яго вельмі не хапае…

— Якімі якасцямі павінен валодаць скульптар?

— Па-першае, яму трэба мець пэўную адукацыю *(усміхаецца)*. А па-другое, быць мастаком, творцам: гэта значыць рабіць нешта такое і так, як не рабілі да яго.

— Вы ўзначальваеце мастацкі факультэт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Раскажыце, якія цяпер мэйн-стрымы ў студэнцкім мастацтве?

— У нас навучаюцца вельмі таленавітыя асобы. Цяпер сюды прыходзяць людзі, якія бачаць сябе ў мастацкай прасторы. Бо ў любой краіне мастаку складана, асабліва пачынаць. Увогуле ж у іх сучасная думка, яны шмат ездзяць на пленэры, і не толькі ў Беларусі.

— Што патрэбна чалавеку, які лічыць сябе мастаком, каб знайсці сваё месца, не тварыць толькі «ў стол»?

— Сапраўднае мастацтва не бывае «ў стол». Мастак можа не атрымліваць за гэта грошай, але ён будзе адчуваць унутранае задавальненне. Неабавязкова яго зразумеюць сучаснікі. Яшчэ Сальвадор Далі сказаў: «Мастак, імкніся да дасканаласці. Табе яе не дасягнуць», а таксама «Не імкніся быць сучасным. Бо ты ўжо сучасны, раз ствараеш у свой час». А разважанні пра сучаснасць-несучаснасць — мне здаецца, гэта нейкая маніпуляцыя, нават камерцыйная праграма. У наш час мастацтва часта хочуць паставіць на рыначныя прынцыпы: можна ўзяць звычайную попельніцу, прыдумаць канцэпцыю і прадаваць яе як аб'ект мастацтва.

Кожны мастак адчувае ў сэрцы сваім, калі ён «трапіў у дзясятачку» і зрабіў тое, што трэба.

— Значыць, сапраўдны мастак — гэта чалавек, які выяўляе тое, што асабіста ў яго ўнутры?

— Так, але перад тым, як прыйсці да свайго стылю, той жа Пікаса шмат маляваў, пісаў з натуры. Ён ведаў школу, вось у чым справа. А зараз ідзе нейкі фарсаж па прынцыпе «час-грошы», быццам чым прасцей, тым лепей — і каб хутчэй прадаць. Тое ж датычыцца, напрыклад, адзення — яго ствараюць карпарацыі. У нас вельмі мала мадэльераў з уласнымі майстэрнямі, якія рабілі б нешта арыгінальнае.

— Аднак беларуская мастацкая школа вядомая і за мяжой…

— Яе можна адрозніць і ад расійскай школы, і ад еўрапейскай. За кошт таго, што мы знаходзімся паміж Захадам і Усходам, у нас вельмі цікавы мастацкі сінтэз. Канцэптуальнасць зліваецца з рэалізмам — асабліва яскрава гэта відаць у сусветна вядомай беларускай графіцы. Справа ў тым, што постсавецкая прастора, у адрозненне ад заходняй, захавала рэалістычную школу на вельмі высокім узроўні. Можна сказаць, што ў гэтым наш гістарычны бонус.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

■ Экслібрыс

СВЯТА ПІСЬМЕНСТВА — СВЯТА КНІГІ

Дзень беларускага пісьменства, што сёлета пройдзе ў старажытным Заслаўі, немагчыма ўявіць без кніг. Тут, на стэндах айчынных выдавецтваў, будуць прадстаўлены самыя яркія навінкі, пройдуць прэзентацыі найбольш адметных выданняў. Натуральна, Выдавецкі дом «Звязда» не застанецца ў баку ад агульнай кніжнай феерыі і пазнаёміць гасцей свята са сваімі новымі праектамі.

ПАЭТЫЧНАЕ ПРЫСВЯЧЭННЕ

Дзмітрый Пятровіч. Адзіноты пажоўклыя дні. — Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2014. — 128 с.



Паэт, празаік, аўтар песень Дзмітрый Пятровіч — жаданы госць на сталічных літаратурна-музычных імпрэзах. На рахунку пісьменніка ўжо ёсць досыць паспяховыя кнігі паэзіі («Белая квецень кахання») і прозы («Белая жанчына»). Сёлета ж аўтар дапоўніў сваю бібліяграфію новым зборнікам вершаў.

Можна сцвярджаць, што кніга «Адзіноты пажоўклыя дні» — своеасаблівае прысвячэнне роднаму гораду паэта — Заслаўю. Тут яго карані, тут усе мясціны знаёмыя, тут — крыніца натхнення, шчасця і радасці. Гэты горад поўніцца цёплымі ўспамінамі пра маленства і юнацтва. Лірычны герой нават сцвярджае, што дзякуючы Заслаўю ён атрымаў свае паэтычныя крылы, і, калісьці ўражаны прыгажосцю навакольля, не змог утрымацца ад напісання прачулага верша. Ды і сёння Дзмітрый Пятровіч, хоць жыве ў Мінску, з радасцю вяртаецца ў роднае Заслаўе, праводзіць тут прэзентацыі, ладзіць літаратурна-музычныя вечарыны. Паэт піша:

Дзе б я ні быў,
а сніцца родны край —
Заслаўскі луг, палі і пералескі.
І першыя вясновыя пралескі
Мілейшыя, чым той замежны рай.

Таму невыпадкова аўтар падкрэслівае «Пакуль са мной радзіма — я жыву…» і такую паэтычную назву дае цэламу раздзелу новай кнігі. Натуральна, так называецца частка, прысвечаная Заслаўю. Думаецца, пачуцці паэта адгукнуцца рэзанансам у душах жыхароў старажытнага горада: хто, як не яны, здольны найлепш адчуць і зразумець вершы, што ствараліся і на іх родных вуліцах, захапіцца прыгажосцю вобразаў, натхнёных сузіраннем такіх знаёмых пейзажаў.

Паэт сам сябе называе рамантыкам, але, падаецца, больш дакладна было б вызначыць яго творчасць як класічна-сентыментальную. Традыцыйны для беларускай паэзіі сілаба-танічны верш, тэмы паэта і паэзіі, пошуку натхнення, матывы трывогі за родны край і родную мову, зачараванасць прыродай і, разам з тым, шкадаванне, што вясна лірычнага героя ўжо прайшла, а наперадзе яго чакае восень... Думаецца, гэтая класічнасць і традыцыйнасць зусім не шкодзяць творам Дзмітрыя Пятровіча. Хутчэй наадварот, ідуць на карысць, бо рыфмаваныя вершы лепш кладуцца на музыку, ператвараюцца ў лірычныя песні ці прачулыя рамансы. А іх лепш за ўсё слухаць восенню, пад шоргат апалага лісця ці акампанемент ветру.

Лірычны герой нават сцвярджае, што дзякуючы Заслаўю ён атрымаў свае паэтычныя крылы, і, калісьці ўражаны прыгажосцю навакольля, не змог утрымацца ад напісання прачулага верша.

ЗНАЁМЦЕСЯ: ЗАСЛАЎЕ

Заслаўе. На ростанях стагоддзяў / уклад. і аўт. тэксту У. І. Бацкалевіч; фота: А. Клешчука і Н. Бужан. — Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2014. — 160 с.



Класічны альбом, прысвечаны нейкаму гораду, можна параўнаць з пашпартам чалавека. Такая кніга ў ідэале мусіць разгледзець мінуўшчыну, распавесці пра нараджэнне, сталенне, звярнуць увагу на асноўныя жыццёвыя крокі. Аўтарам патрэбна засяродзіцца і на сучаснасці: культурным, эканамічным, сацыяльным жыцці, спыніцца на адметных рысах мясцовых жыхароў, пашукаць знакамітых выхадцаў, творцаў, якія шмат намаганняў прыклалі дзеля развіцця і праслаўлення краю. Гартаючы старонкі такога выдання, чытач павінен здзейсніць падарожжа ў гісторыю горада, а таксама прайсціся па яго сучасных вуліцах. Задача складаная, тым больш што аб'ём «пашпарта» — абмежаваны, ды і сучасны чытач, заняты неадкладнымі справамі, мае не так шмат часу на вывучэнне доўгіх тэкстаў.

Але можна сцвярджаць, што калектыў, які працаваў над альбомам «Заслаўе. На ростанях стагоддзяў», выканаў заданне на «выдатна». Аўтар тэксту Уладзімір Бацкалевіч лаканічна і змястоўна распавёў пра асноўныя моманты гісторыі і сучаснасці Заслаўя. Фотамастакі Надзея Бужан і Анатоль Кляшчук зрабілі сапраўды бліскучыя фотаздымкі, а дызайнер Георгій Шаблюк распрацаваў якасны макет кнігі, дзе ўсё лаканічна, лагічна, прыгожа і паслядоўна. У выніку альбом, што мае маленькі аб'ём — усяго 160 старонак, здольны адказаць фактычна на любое пытанне пра старажытны горад.

Летапіс Заслаўя, што змяшчае самыя важныя ў яго гісторыі даты, пачынаецца з 1127 года, калі ў пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца Заслаўскае княства, і да верасня 2014 года, калі тут праходзіць Свята беларускага пісьменства. Аўтар тэксту больш дэталёва спыняецца на постацях полацкай князёўны Рагнеды, кіеўскага князя Уладзіміра і іх сына Ізяслава, чыё імя ў старажытнасці дало назву паселішчу. Архіўныя фотаздымкі пачатку XX ст. — згадкі пра мінулае заслаўскіх храмаў. Тут жа можна знайсці і расшыфроўку кода герба Заслаўя.

Натуральна, старажытны горад хавае мноства таямніц, а ў яго будынках можна пабачыць сапраўдныя скарбы. У ліку загадак гісторыі — месца размяшчэння магілы Рагнеды. Мясцовыя жыхары падказваюць, што князёўна пахавана на... гарадзішчы «Замэчак». І няхай гэта проста сімвал, ды з цягам часу ўжо і гарадзішча ператварылася ў месца роздуму, пошуку натхнення і адказаў на важныя жыццёвыя пытанні. Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» таксама здольны ўразіць наведвальніка, менавіта ён мае самую буйную сярод музеяў краіны калекцыю маляваных дываноў — 234 адзінкі; з іх 40 дываноў Язэпа Драздовіча і 11 твораў Алены Кіш.

Думаецца, віртуальнае знаёмства з Заслаўем стане першым крокам да рэальнай сустрэчы. Ехаць жа недалёка!

СВЯТЫЯ І ГРЭШНІКІ

Таццяна Падаляк. Вайна — самы страшны грэх: маральна-публіцыстычны дослед. — Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2014. — 320 с.

Распавядаць пра любую вайну — справа складаная. Псіхалагічна. Маральна. Складана распытваць сведкаў падзей, уздымаць балючыя для асобнага чалавека ды і ўсяго грамадства пытанні. Але ж гэта патрэбна, хаця б дзеля захавання памяці пра падзеі нашай мінуўшчыны.

У беларускай культурнай прасторы існуе досыць шмат формаў прадстаўлення падзей вайны. Мастацкая проза і мастацкія фільмы, запісы ўспамінаў, дакументальныя сведчанні. Тэма Вялікай Айчыннай досыць часта ўздымаецца на старонках перыёдыкі. Здавалася б, асобныя газетныя публікацыі: інтэрв'ю, эсэ, інфармацыя пра падзеі, звязаныя з вайной, раскіданыя па бясконцых друкаваных старонках, не маюць вялікага ўздзеяння на чытача. Але калі сабраць іх разам — то можна пабачыць цэласную карціну, складзі амаль поўнае ўяўленне пра тое, што адбываецца сёння з нашай памяццю пра вайну.

Гісторыкі кажуць, што пра вайну нельга распавесці ні ў фільме, ні ў музейнай экспазіцыі. Бо пры ўмове поўнай рэалістычнасці паказу, ніхто не хацеў бы апынуцца ў такім музеі, глядзець такі фільм.

Новая кніга вядомага журналіста і даследчыка Таццяны Падаляк — якраз з такіх комплексных выданняў. Таццяна Уладзіміраўна цягам многіх гадоў займаецца вывучэннем тэмы Вялікай Айчыннай. На старонках газет, часопісаў часта публікуюцца яе інтэрв'ю з ветэранамі, даследчыкамі ваенных падзей. У сваіх эсэ аўтарка разважае пра маральнасць, уздымае балючыя для грамадства пытанні. Напрыклад, ці варта нам усталёўваць помнікі нямецкім салдатам, што пахаваны ў краіне. Ці павінны немцы і сёння адчуваць пакаянне, наведваючы беларускія землі? Ці бываюць на вайне святыя? І хто ў такіх умовах з'яўляецца грэшнікам?

Гісторыкі кажуць, што пра вайну нельга распавесці ні ў фільме, ні ў музейнай экспазіцыі. Бо пры ўмове поўнай рэалістычнасці паказу, ніхто не хацеў бы апынуцца ў такім музеі, глядзець такі фільм. Было б надта страшна. Гэта як бачыць ворага са зброяй у руках і адчуваць, што ты — пад прыцэлам. Але што рабіць з успамінамі людзей, якія перажылі гэты жах? Іх трэба занатоўваць. Захоўваць. Каб памяталі і больш не грашылі.

НЕЗАБЫТЫЯ ВОІНЫ

Последний приют солдата = Letzte Ruhestatte fur die Soldatten / А. В. Шарков и др. — Минск: Издательский дом «Звязда», 2014. — 208 с.

Сёлета ў Еўропе незвычайна часта згадваюцца падзеі Першай сусветнай вайны. Стагоддзе з дня пачатку — выдатная нагода прыгадаць факты, успомніць герояў, перачытаць раманы аўтараў «страчанага пакалення». Таму і кнігарні еўрапейскіх сталіц поўняцца новымі выданнямі, прысвечанымі Першай сусветнай.

Не адстае ў гэтых адносінах і Беларусь. Сёлета ў нашай краіне выйшла досыць многа новых кніг, прысвечаных падзеям Першай сусветнай. Аддалі мы і даніну памяці пісьменніку-салдату Максіму Гарэцкаму, перавыдаўшы яго запіскі «На імперыялістычнай вайне» (Выдавецкі дом «Беларуская навука»).

Кніга «Апошні прытулак салдата» займае асаблівае месца ў шэрагу праектаў да 100-годдзя з пачатку вялікай вайны. Яна каштоўная не толькі для беларусаў і рускіх, але і для ўсіх краін, чые сыны ваявалі на франтах Першай сусветнай. Нягледзячы на варожасць народаў сто гадоў таму, сёння пад адной вокладкай сабраны апісанні і фотаздымкі месцаў пахавання аўстра-венгерскіх, нямецкіх і расійскіх ваеннаслужачых на тэрыторыі Брэсцкай, Віцебскай і Мінскай абласцей Беларусі. Таму невыпадкова кніга выйшла ў фармаце білінгва — на рускай і нямецкай мовах.

У выданні прыводзіцца пералік пахаванняў часоў Першай сусветнай, дапоўнены якаснымі фотаздымкамі і апісаннем стану кожнага з мемарыялаў. Групай аўтараў праведзена вялікая праца па складанні зводнай табліцы са згадкай усіх вядомых на сёння пахаванняў. Некаторыя салдацкія могілкі цяпер закінутыя, але многія — даглядаюцца мясцовымі рупліўцамі, валанцёрамі з Беларусі і Германіі, на іх усталяваны помнікі ці памятныя знакі. Спадзяюся, пасля выхаду кнігі забытых салдацкіх магіл будзе менш, бо сёння валанцёры дакладна ведаюць, куды кіравацца і дзе працаваць дзеля захавання памяці.

ПАД НАГЛЯДАМ САВЫ

Геннадий Авласенко. Как зверята правила безопасности на воде изучали; художник Оксана Аракчеева. — Минск: Издательский дом «Звязда», 2014. — 40 с.

Пазнаёміць дзетак з правіламі бяспечных паводзін — задача надзвычай складаная. Непаседлівыя і энергічныя, малыя не хочуць слухаць доўгія і занудныя прамовы пра дазволы і забароны, нормы і абмежаванні, нават калі іх распавядае строгі дзядзька ў пажарнай форме. Ратавальнікі ж ведаюць, што пра небяспеку лепш папяроджваць загадзя, чым потым выпраўляць памылкі, зробленыя па няведанні. Бо яны бываюць непапраўнымі і могуць нават каштаваць жыцця.

Але калі да справы знаёмства з правіламі паводзін далучаюцца казачныя сябры — медзведзяня Таптыжка, зайчаня Тарапыжка, барсучаня Борка і бабраня Цішка, якія, як дзеці пад наглядам бацькоў ці выхавальнікаў, знаходзяцца пад пільным кантролем строгай Савы з мянушкай Мудрая галава, увесь сумны працэс ператвараецца ў вясёлую гульню. Так, кніжная серыя «Звязды» «Пра бяспеку дзецям» — новы сумесны праект Выдавецкага дома, Міністэрства інфармацыі краіны і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі — дапаможа бацькам, выхавальнікам, настаўнікам і супрацоўнікам МНС весела і эфектыўна пазнаёміць дзетак з правіламі паводзін у розных мясцовасцях.

Заняткі па асновах бяспекі жыццядзейнасці ператворацца ў чытанкі-гульні, а па матывах кнігі нават тэатралізаваныя прадстаўленні можна ладзіць, прыцягнуўшы да працы саміх вучняў. Казка Генадзя Аўласенкі, напісаная адмыслова для выдання ў межах серыі, выдатна падыходзіць для гэтых мэтаў.

Марына ВЕСЯЛУХА.

НА ЛЮБЫ ЧЫТАЦКІ ГУСТ

Амаль два гады прайшло з таго часу, як Выдавецкі дом «Звязда» аб'яднаў пад сваім дахам найстарэйшую ў краіне беларускамоўную газету «Звязда» і літаратурна-мастацкую перыёдыку Беларусі: штотыднёвую газету «Літаратура і мастацтва», часопісы «Полымя», «Нёман», «Маладосць» і «Вожык». Падчас святкавання Дня беларускага пісьменства, да якога гэтыя выданні маюць непасрэднае дачыненне, мы асобна раскажам пра кожнае з іх на старонках «Звязды».

З «ПОЛЫМЕМ» У СЭРЦЫ



«Полымя» — гэта новыя творы лепшых айчынных пісьменнікаў і невядомая літаратурная спадчына. Гэта архіўныя гістарычныя дакументы і дзённікі славутых суайчыннікаў. Гэта інтэрв'ю з цікавымі людзьмі і дыскусіі на самыя актульныя тэмы культурнага жыцця краіны.

Чытайце на старонках часопіса аповесці «Прыгоды сарамлівага карэспандэнта» Віктара Гардзея, «Паўночны вецер для спелых пладоў» Юрыя Станкевіча, «Атамізацыя» Васіля Гігевіча, «Закон захавання кахання» Зінаіды Дудзюк, а таксама пасляваеннныя ўспаміны Міколы Лобана. У бліжэйшых нумарах «Полымя» — лісты Уладзіміра Дубоўкі да Уладзіміра Конана, артыкулы і эсэ Івана Саверчанкі, Адама Мальдзіса, Лады Алейнік, Алеся Марціновіча і Казіміра Камейшы. У вялікай падборцы матэрыялаў пад агульнай назвай «Літаратурныя часопісы: у пошуках страчанага» — развагі вядомых беларускіх і замежных пісьменнікаў пра тое, якое месца займаюць сёння літаратурныя часопісы ў грамадскім і культурным жыцці, і што можна і трэба зрабіць, каб прыцягнуць да іх большую чытацкую цікавасць.

ЧАСОПІС ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЎМЕЕ ЧЫТАЦЬ



«Нёман» — часопіс-адлюстраванне сучаснага культурнага жыцця Беларусі, блізкага і далёкага замежжа. Гэта творы лепшых сучасных пісьменнікаў Беларусі і Расіі, якія пішуць на рускай мове, пераклады беларускай і замежнай прозы, паэзіі, публіцыстыкі, крытыкі, артыкулы і інтэрв'ю, прысвечаныя праблемам будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, матэрыялы, якія распавядаюць аб незвычайных жыццёвых сітуацыях і лёсах, артыкулы пра яркія з'явы і дзеячаў тэатра, жывапісу, музыкі і многае іншае

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ДЫСКУСІЙ І ТВОРЧАСЦІ

«Літаратура і мастацтва» («ЛіМ») — сапраўдны інфарматар пра надзённыя пытанні дзяржаўнай палітыкі ў галіне літаратуры, мастацтва і кнігавыдання, пра асноўныя напрамкі дзейнасці Саюза пісьменнікаў Беларусі ў справе духоўнага фарміравання асобы і нацыі, захавання нацыянальнай культурнай спадчыны, пра стасункі з літаратарамі краін СНД, развіццё народнай творчасці і інш. На яе старонках выступаюць пісьменнікі, літаратуразнаўцы, дзеячы мастацтва, кнігавыдаўцы, бібліятэкары, гісторыкі, краязнаўцы, выкладчыкі ВНУ, творчая моладзь.

Штотыднёвік публікуе агляды найбольш цікавых і папулярных выданняў, гутаркі з творцамі, мастакамі-графікамі, рэйтынгі продажу кніг у розных гарадах Беларусі, фотарэпартажы з кнігарняў краіны і замежжа.

ХТО З «ВОЖЫКАМ» СЯБРУЕ, ТОЙ НІКОЛІ НЕ СУМУЕ!

У разнастайным шэрагу літаратурна-мастацкіх і публіцыстычных выданняў Беларусі асаблівае месца займае адзіны ў рэспубліцы ілюстраваны часопіс сатыры і гумару «Вожык», слаўная гісторыя якога пачалася ў далёкім 1941-м годзе з выхаду газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». З таго часу і па сёння на старонках часопіса друкуюцца лепшыя творы беларускіх паэтаў, празаікаў, мастакоў-карыкатурыстаў, закліканыя не толькі паляпшаць настрой чытачам, але і адмысловымі сродкамі сатыры і гумару змагацца з негатыўнымі з'явамі ў жыцці грамадства. Традыцыі, закладзеныя за шматгадовую гісторыю рэдактарамі выдання (а сярод іх — вядомыя пісьменнікі Кандрат Крапіва, Уладзімір Корбан, Валянцін Блакіт, Міхась Пазнякоў, Алесь Пісьмянкоў, Уладзімір Саламаха), працягваюцца і сёння. А побач з традыцыямі на старонках часопіса з'яўляюцца арыгінальныя аўтарскія знаходкі — ілюстраваныя казкі і фельетоны, вершаваныя гумарэскі, маляваныя іранескі... І ўсё гэта — на найлепшым літаратурным-мастацкім узроўні, ярка і з густам афармленае, каб кожны раз пры сустрэчы з «Вожыкам» нават самы патрабавальны чытач атрымліваў сапраўднае задавальненне.

З «МАЛАДОСЦЮ» ПА ЖЫЦЦІ НЕЯК РАДАСНЕЙ ІСЦІ!



Часопіс, да стварэння якога прыклаў руку легендарны Машэраў. Выданне, якое не адпавядае ніякім стэрэатыпам мыслення. Старонкі, якія літаральна прымушаюць глядзець на літаратуру па-новаму. Проза і паэзія Айчыны — ад пакалення звышновай эры. «Зоркі» маладой літаратуры замежжа — па-свойску, па-беларуску. Тэрыторыя эксперыментаў і почыркаў. Адным словам, ёсць чым зачытацца.

Менавіта дынамічная «Маладосць» тры гады апекавала часопіс для дзяцей «Бярозка». Калі той адчуваў часовыя цяжкасці і спыніў свой выхад, яна друкавала яго як свой дадатак. З 2015 года «Бярозка» зноў пачне выходзіць, і ў новым фармаце!

АДКРЫЙ ДЛЯ СЯБЕ «БЯРОЗКУ»!

Гэты часопіс прыдумалі для дзяцей даўно-даўно вельмі клапатлівыя дарослыя. Гэта і літаратурнае выданне для дзяцей, і творы, напісаныя дзецьмі. У розныя гады ён па-рознаму называўся і па-рознаму выглядаў, а сёння літаральна просіцца да цябе ў рукі такімі важнымі словамі з вокладкі: «Светам кіруе той, хто чытае». Кіраваць светам — значыць, быць чараўніком і ствараць для людзей нешта добрае — што заўгодна! Часопіс «Бярозка» будзе вучыць цябе гэта рабіць. Проста таму, што ён чароўны.

ЧЫТАЙЦЕ І ЛЮБУЙЦЕСЯ!

З пачатку гэтага года да цеснай сям'і перыядычных выданняў Выдавецкага дома «Звязда» далучыўся часопіс «Родная прырода».

У цэнтры ўвагі выдання — прыродныя аб'екты, якія маюць сусветнае гучанне: нацыянальныя паркі, запаведнікі, малыя і вялікія насельнікі лясоў, лугоў і балот, дзівосны свет раслін.

Аўтары часопіса — спецыялісты розных узроўняў, якія прафесійна валодаюць прыродаахоўнай тэматыкай, і чытачы «Роднай прыроды», якія шмат гадоў сябруюць з выданнем. А яшчэ — вядучыя айчынныя фотамайстры на здымках якіх — наша прырода ва ўсёй непаўторнай красе.

Напэўна, кожны ведае, што лепшы спосаб не прапусціць ніводнага нумара любімага часопіса ці газеты — аформіць падпіску на выданне. Калі гэта зрабіць на Дні беларускага пісьменства 6 ці 7 верасня на стэндзе РУП «Беллпошта», вы атрымаеце падарунак ад Выдавецкага дома «Звязда».

«ДОБРАЯ ЛІТАРАТУРА — ГЭТА...»

Кніга — асаблівая матэрыя. Яна дапамагае цікава правесці час, павышае эрудыцыю, пашырае кругагляд, дае магчымасць нават выпрацаваць неабходныя якасці характару... Чытачы «Звязды» расказалі пра месца чытання ў сваім жыцці.

Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па бюджэце і фінансах:

— Натуральна, што вялікую ўвагу я надаю чытанню эканамічнай літаратуры, абавязкова праглядаю перыядычныя выданні гэтага кірунку. У свой час, перад тым, як стаць кіраўніком прадпрыемства, я прачытала кнігу Дэйла Карнегі «Як заваяваць сяброў і аказваць уплыў на людзей». Гэта кніга вельмі ўразіла мяне. Я думаю, што яна дапамагае выхаваць сябе і як паспяховага чалавека, і як кіраўніка.

Скажу, што мне вельмі падабаецца і гістарычная літаратура: гэта і цікава, і карысна. Каб не паўтараць памылак мінулага, трэба яго ведаць. Ды і вопыт продкаў можа многаму навучыць сучаснікаў. Люблю чытаць і кнігі з серыі «Жыццё знакамітых людзей». Пра людзей, якія ўплывалі на гістарычныя падзеі, дабіліся многага ў розных галінах — палітыцы, навуцы, культуры, ваеннай справе.

Вольга ЗУЕВА, кандыдат філалагічных навук, выкладчыца філалагічнага факультэта БДУ:

— Падчас знаёмства з мастацкім творам чалавек можа адначасова зведаць цэлы шэраг перажыванняў: тугу ад недасканаласці свету і зачараванне яго прыгажосцю, сорам за сябе і радасць, смутак і шчасце... Наўрад ці знойдзецца хтосьці зусім незнаёмы са станам, які ў старажытнай Грэцыі атрымаў назву «катарсіс». Дык вось, добрая мастацкая літаратура — гэта катарсіс.

Літаратура неабходна для эстэтычнага развіцця асобы. Звяртаючыся да кніг, чалавек не можа не стаць хоць трохі лепшым. Асабліва ў дзяцінстве. Гуманістычны эфект мастацкай літаратуры велізарны.

Літаратура дазваляе чалавеку не адчуваць сябе адзінокім. Заўсёды знойдзецца кніга, пасля чытання якой ты ўсклікнеш: «І я так думаў! І я тое ж адчуваю! І ў маім жыцці было такое!..» Кнігі — гэта моцная кампенсацыя многіх жыццёвых нягод. Трэба толькі знайсці «сваіх» пісьменнікаў, сваіх аднадумцаў. Шукаць можна любымі метадамі: пытацца ў сяброў і родных, пачынаць чытаць «наўгад» першую кнігу з паліцы, глядзець у інтэрнэце папулярныя спісы накшталт «100 галоўных кніг у гісторыі чалавецтва»... Галоўнае — пачаць шукаць.

Дзмітрый СУБЦЕЛЬНЫ, старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА»:

— Мы, як прадстаўнікі маладзёжнай арганізацыі, якая надае вялікае значэнне развіццю інфармацыйных тэхналогій, пра кнігі не забываемся. У офісе Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА ёсць некалькі буккросінгавых паліц — любы ахвотны можа прыйсці і ўзяць пачытаць якую-небудзь з кніг.

Што да мяне, то любімая кніга — гэта... геаграфічны атлас. Ён можа расказаць уважліваму чытачу і пра гісторыю, і пра сучаснасць, з дапамогай атласа можна рабіць прагнозы і на будучыню. Атлас цікавы мне і як падарожніку — я пабываў больш чым у 30 краінах, і не думаю спыняцца на гэтым — менавіта гэтая «кніга» дапамагае скласці мне маршруты будучых паездак. Пакуль жа любімы «канечны пункт» — Італія.

Святлана ХАСЯНЕВІЧ, экскурсавод музея «Прастора Хаіма Суціна» (гарадскі пасёлак Смілавічы Чэрвеньскага раёна):

— Для музейнага работнік чытанне — гэта неад'емная частка працы. Нам гэта неабходна як ежа, каб потым нашы наведвальнікі заставаліся задаволенымі экскурсіямі. У апошні час чытаю шмат біяграфій мастакоў, кніг пра іх творчасць. Асабліва, што не дзіўна, мне цікава чытаць кнігі пра Хаіма Суціна — мастака, які нарадзіўся ў яўрэйскай сям'і ў Смілавічах, а пасля яго карціны сталі сусветна вядомымі. Твор рускай мастачкі Марэўны (Марыі Вараб'ёвай-Сцябельскай) «Маё жыццё з мастакамі «Вулля» — адзін з самых любімых. Магчыма, некаторыя з фактаў, выкладзеных там, перабольшаныя. Але ў цэлым кніга каштоўная, бо расказвае пра жыццё мастакоў Парыжскай школы — некаторыя гісторыі аказваюць проста непараўнальнае ўражанне. Што да перыядычных выданняў, то я — даўняя чытачка «Звязды».

Іван ГАРГУН, малады бізнесмен, уладальнік цырульні:

— На другім курсе прачытаў кнігу Роберта Кіясакі «Багаты тата — бедны тата», якую параіў мне знаёмы бізнесмен. У аснове кнігі ляжаць два розныя прынцыпы фінансавага выхавання, якія атрымаў Роберт ад свайго роднага бацькі — дзяржаўнага служачага, і ад бацькі свайго сябра Майка — бізнесмена, які, па словах Кіясакі, пасля стаў адным з самых багатых людзей на Гавайскіх астравах.

У нейкім сэнсе гэта кніга змяніла маё жыццё. Я выбраў шлях «багатага таты». Увесь трэці курс вывучаў эканоміку і збіраў грошы, а на чацвёртым разам з сябрам мы адкрылі цырульню. Яна працуе ўжо другі год, і колькасць паслуг, якія мы прапануем, расце...

Надзея ЮШКЕВІЧ.

■ Помніць, шанаваць, ганарыцца

ЕЎФРАСІННЯ

Слова — Мудрае і Прасветлае — жывіць увесь люд на планеце. Яно кранае нашы душы і духоўна яднае нас з іншымі народамі, трывала лучыць з нябесна-зямною прастораю.

Полацкая князёўна Прадслава, род якой цягнецца ад Ізяслава — сына Рагнеды Рагвалодаўны і кіеўскага князя Уладзіміра Святаслававіча, у маленстве адчула магутную сілу Мудрага Слова. Успрыняўшы яго, яна спраўдзіла прыродную наканаванасць — несці асвету ў грамаду, адорваць радасцю ўсіх прысутных, памнажаць харство на полацкай зямлі.

Леанід Дранько-Майсюк перадаў істотны і вельмі адказны момант у жыцці зямлян — апошнія хвіліны перад сконам. У гэтыя пачуццёва абвостраныя імгненні ў свядомасці нябогі ўзнікаюць абрысы жыццёвага шляху, праступае адчуванне значнасці сваёй прысутнасці ў зямной прасторы. Святая Еўфрасіння — гэтае імя князёўна атрымала ў манастыры — перад вечным спачынам бачыла полацкія краявіды. Там яна перапісвала кнігі, складала летапісы, пабудавала жаночы і мужчынскі манастыры, якія сталі цэнтрамі асветніцтва. Здзейсненым паломніцтвам у Ерусалім яна духоўна паяднала родны край з Хрыстовымі мясцінамі.

Паэт пісаў мастацкі тэкст на ўжо гатовую мелодыю, створаную Аляксандрам Балотнікам, кіраўніком ансамбля народнай музыкі «Бліскавіца». Леанід Дранько-Майсюк пранікся духоўнай дзейнасцю святой Еўфрасінні і яе музычным вобразам, харальным гучаннем твора.

Песня «Еўфрасіння» Леаніда Дранько-Майсюка і Аляксандра Балотніка заўсёды выклікае душэўнае хваляванне і ў выканаўцаў, і ў слухачоў. Спявачка Галіна Грамовіч не ўтойвала слёзы ачышчэння, як і прысутныя ў Полацкім Сафійскім саборы, пры асвячэнні новага вакальнага твора падчас ушанавання памяці нашай духоўнай апякункі, святой Еўфрасінні Полацкай 5 чэрвеня 1994 года.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.



Верш Леаніда Дранько-Майсюка
Музыка Аляксандра Балотніка

Ты спачын знайшла
У палясцінскім краі.
Журба аліў злятае
З твайго чала.
Твае малітвы памятае
Вечная зямля святая.

Прыпеў:
Еўфрасіння, пад алівамі
Сніла ты ў апошнім сне
Воблака шчаслівае,
Што купалася ў Дзвіне;
Сніла і той дзень балесны,
Калі брала шлюб нябесны...
Полацак свой бачыла ў тумане.

Цень жалобы лёг
На твар Ерусаліма...
Жыла ў душы радзіма,
А ў сэрцы — Бог.
Плыла радзіма над вачыма
Сінім дымам, сінім дымам.

Прыпеў:
Светла пад алівамі
Сніла ты ў апошнім сне
Воблака шчаслівае,
Што купалася ў Дзвіне;
Сніла і той дзень балесны,
Калі брала шлюб нябесны...
Полацак свой бачыла ў тумане.

ЧАКАЕМ ВАС, ВІТАЕМ ПЕСНЯЙ

Як ніколі раней, прыемна віншаваць удзельнікаў, а таксама пераможцаў абласнога спаборніцтва ў дзень фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2014».

Чакаем вас, вітаем песняй,
Снапамі спелай збажыны.
Хай будзе вам між кветак цесна
Пад сонцам восеньскай вясны.
Удзячны вам усім пінчане,
Бо разам мы — дзяржавы моц.
Дзень гэты будзе незвычайным,
З салютам зорным — у гэту ноч!

З павагай, Аляксандр Лявонцьевіч АНДРЫЕВІЧ, старшыня Пінскага райаграпрамсаюза.
УНП 201016437

СЁННЯ НА ПАЛЕССІ — СВЯТА

Абласны фестываль-кірмаш "Дажынкі-2014" у Пінску з удзелам старшыні Брэсцкага аблвыканкама Канстанціна Сумара — на гэты раз вельмі памятнае мерапрыемства з урачыстым адкрыццём помніка Хлебу. З гэтай нагоды шчыра віншую ўсіх удзельнікаў фестывалю, а таксама пераможцаў абласнога спаборніцтва на жніве са святам. Няхай яно сёння завітае ў кожны дом, у кожнае сэрца земляроба. Жадаю ўсім аратым, сейбітам і жняцам моцнага здароўя, дабрабыту і згоды ў сем'ях, новых працоўных перамог, аптымізму ў жыцці і даўгалецця.

З павагай, Міхаіл Мікалаевіч СТРАПКО, старшыня Брэсцкага абласнога аграпрамсаюза.
УНП 200193308

По результатам внеочередного общего собрания акционеров
ОАО Минский домостроительный комбинат»
выплата дивидендов за первое полугодие 2014 года акционерам-физическим лицам будет производиться с 1 октября 2014 года по 30 октября 2014 года в установленном порядке из расчета 2 332 рубля на одну акцию (за вычетом налога на доходы).
Телефон для справок: (8017) 2072060 – отдел инвестиций; телефон депозитария ООО «Лидеринвест»: (8017) 2130213 (ул. Пономаренко, 35а, к. 241).
Директор В.Н. Песецкий Главный бухгалтер Н.С. Кармызов
УНН 100258980

Бобруйское управление филиала
«Центр «Белтехинвентаризация»
ОКАЗЫВАЕТ УСЛУГИ ПО:
- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:
16 сентября 2014 г. в 11.00
СОСТОИТСЯ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже недвижимого имущества,
принадлежащего на праве собственности ОАО «Белшина», в составе:
Лота № 1 (предмет торгов):
Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 730/U-15754 (здание административно-хозяйственного назначения),
общей площадью 7458,0 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 1

Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, (р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369, ОКПО 55484006)
Продавец предмета торгов	Открытое акционерное общество «Белшина», УНП 700016217, Минское шоссе, 213824, г. Бобруйск, Могилевская область
Место проведения торгов и подачи документов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»
Начальная цена продажи, рублей без НДС	14 057 314 389 рублей без учета НДС, задаток 5%, что составляет – 702 865 719 рублей, шаг аукциона – 5%
Номер расчетного счета для перечисления задатка	Получатель платежа ОАО «Белшина» – р/с 3012000003446 в ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО 147621337000
Информация о земельном участке	Земельный участок, расп. по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 1, общ. пл. – 0,3488 га, состоит: участок № 1 с кадастр. номером 724050100001005539 пл. – 0,3478 га, участок № 2 с кадастр. ном. 724050100001005540 пл. – 0,0005 га, участок № 3 с кадастр. номером 724050100001005541 пл. – 0,0005 га, правовой режим – право постоянного пользования, правообладатель – ОАО «Белшина».
Характеристика предмета торгов	
Здание административно-хозяйственное – стены ж/б плиты, частич. кирпич, фундамент ж/б, перекрытия ж/б, крыша совмщ. рулонная, полы бетон., степень гот. – 93%; санитарно-техн. устройства: отопление – стал. трубы.част. пластинчатые батареи, степень гот. – 30%; водопровод – част. стал. трубы, степень гот. – 30%; канализация – част.чугун. трубы, степень гот. – 30%, электроосвещение – част. скрытая проводка, степень гот. – 50%, крыльцо – ж/б перекрытие на метал. опорах	
Условия продажи	При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	Определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи
Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка	по 10 сентября 2014 г. включительно до 16.00

Победитель (претендент на покупку) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до17.30

■ Заўсёды ў сэрцах

ШЛЯХАМІ ПАМЯЦІ І ВЕРЫ

Міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў» з Дабрадатным агнём ад Гроба Гасподняга штогод прыбывае на адкрыццё ўрачыстасцяў, прысвечаных Дню беларускага пісьменства, і з'яўляецца знакавай часткай гэтага свята... Званамі абвесцяць яе прыход і сёлета ў старажытным Заслаўі. Кожны год экспедыцыя праходзіць па новых маршрутах, але, куды б ні кіраваліся яе ўдзельнікі, яны абавязкова пачынаюць шлях са Святога поля, што пад Баранавічамі.

Цуд Святога поля

Гэта ціхае поле знаходзіцца недалёка ад ажыўленай аўтамагістралі Брэст — Масква. На працягу многіх стагоддзяў тут нібы акумуляваліся сляды крывавых гістарычных падзей.

У XVII стагоддзі абшары сталі месцам жорсткіх баёў і знішчэння чарговай хвалі шведскіх захопнікаў. У Першую сусветную вайну каля маляўнічых пагоркаў над Шчарай зноў гінулі салдаты — фронт у гэтых мясцінах стаяў тры доўгія гады. Было такое, што рускія войскі за тыдзень гублялі больш за 80 тысяч чалавек. Праз чвэрць стагоддзя поле зноў ахапіла полымя вайны — Вялікай Айчыннай, зноў урэзаліся ў зямлю акопы, умацаванні...

А яшчэ на Святым полі былі могілкі — на іх стагоддзямі хавалі сваіх суродзічаў сяляне васьмі навакольных вёсак. Непадалёку стаяла-красавала Свята-Іаана-Прадцечанская царква. Усё гэта было зруйнавана, усё адклалася горкай памяццю ў зямлю.

Відаць, невыпадкова ў 1983 годзе падчас земляных работ на гэтым полі быў знойдзены абраз Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Перад людзьмі ён з'явіўся з зямлі, якую насыпаў коўш экскаватара. Абраз нібы звяртаўся да ўсіх: не трэба непакоіць поле з прахам воінаў і мірных жыхароў. Знаходка нібы наказвала: «Ніколі больш не пускайце сюды бяду, нясіце людзям згоду і мір».

У наступныя гады абраз спрыяў шмат якім добрым справам: з ім звязваюць вылячэнне вернікаў і нават перамогу над лясным пажарам. Гэты абраз неўзабаве стаў пуцяводным для Міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў» з Дабрадатным агнём ад Гроба Гасподняга. У 2000 годзе абраз са Святога поля быў праслаўлены як цудатворны Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы.

Заклiканыя iсці разам

Побач з абразом экспедыцыя нясе лампаду, якая запалена ад цудадзейнага агню ў галоўным хрысціянскім храме Іерусаліма. Гэты агонь з'яўляецца там штогод перад Вялікаднем — на месцы, дзе калісьці ляжаў зняты з крыжа Хрыстос.

Цікава ведаць, што такія лампады для экспедыцыі беларускія майстры вырабляюць з улікам усіх складаных сітуацый, якія могуць сустрэцца на шляху (вецер, дождж, моцная вібрацыя ў час перавозкі). Да таго ж яе канструкцыя павінна дазваляць «падсілкаваць» агеньчык алівай у палявых умовах.

Што яшчэ прыносіць экспедыцыя на сустрэчы з жыхарамі гарадоў і вёсак? Безумоўна, галоўны яе «багаж»-веды. Святары, навукоўцы, дзеячы культуры і мастацтва на час экспедыцыі добраахвотна прымаюць няпростыя клопаты паломніцтва — несці і перадаваць гэты галоўны скарб чалавецтва. Супольнае набажэнства, выступленні ў школьных і студэнцкіх аўдыторыях, сустрэчы з мясцовымі аматарамі краязнаўства і мастацтва, наведванне прытулкаў і бальніц — усё гэта абумоўлена навукова-асветніцкай мэтай экспедыцыі.

За два дзесяцігоддзі працы ў складзе экспедыцыі я не бачыў такога, каб тыя, хто сустракаў нас, без цікавасці слухалі Галоўнага захавальніка Дабрадатнага агню ад Гроба Гасподняга, кандыдата багаслоўя, загадчыка кафедры Тэалагічнага інстытута Белдзяржуніверсітэта айца Сергія Гардуна, пісьменніцу Ніну Загорскую, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук доктара філалагічных навук Сцяпана Лаўшука, археолага, доктара гістарычных навук Пятра Лысенку, народную артыстку Беларусі Марыю Захарэвіч...

Брэсцкая крэпасць таксама была асвечана святым агнём з Іерусаліма.

Няхай не пакрыўдзяцца тыя, каго я не назваў у гэтым кароткім пераліку — за дваццацігоддзе мноства славутых дзеячаў былі запрошаны ў паломніцтва і плённа працавалі на шляху да Святыняў.

У промнях непагаснага агню

Памятаю той дзень, калі па вузкіх вулачках старога Іерусаліма я ўпершыню падышоў да ўвахода ў храм, дзе каменне і пясок калісьці бачылі ўваскрэсенне Ісуса Хрыста. Я запальваў сваю свечку ад агню, які ва ўсе стагоддзі шануюць на ўсіх кантынентах, і адчуваў яго магічнае прыцягненне. Не памылюся, калі скажу, што тое ж самае адчувалі мільёны жыхароў планеты, якія пабывалі тут з надзеяй умацаваць сваю веру.

Варта нагадаць, што гэты агонь быў упершыню прынесены на беларускую зямлю 20 мая 1992 года.

Вось што напісаў епіскап Новасібірскі і Бердскі Сергій у сваёй кнізе «Праўдай будзе казаць». У 1992 годзе напярэдадні Вялікадня яму выпаў гонар з надзвычайнай місіяй данесці лампаду ад Гроба Гасподняга з Іерусаліма праз усе славянскія



Лампада з агнём, запаленым каля Гроба Гасподняга.

радыёмашына з запісамі званоў і царкоўных спеваў. Напярэдадзе духавенства крочаць дзеці з букетамі. Пасля набажэнства народ выносіць запаветны агеньчык у самаробных лампадках...»

А вось што пісала пра гэту падзею 22 мая 1992 года газета «Звязда»: «Непагасная лампада прыйшла да нас на свята славянскага пісьменства і славянскіх культур. Яе неслі тым шляхам, якім ішлі да нас святыя роўнаапостальныя Кірыла і Мяфодзій, несучы людзям святло ведаў і духоўнасці... Людзі падрыхтавалі свае свечкі, каб панесці часцінку Святога агню ў сваё жытло, у свае сем'і...»

З вопыту ўсіх мінулых экспедыцый, пасля мноства сустрэч з вернікамі і тымі, хто сябе называе далёкімі ад царквы, я магу дакладна адказаць на пытанне пра тое, які момант на шляху экспедыцыі застаецца ў памяці як самы яскравы. Дзе б тое ні адбывалася — у вялікім горадзе ці ў маленькай вёсачцы, усюды самым знакавым было і застаецца імгненне, калі людзі запальваюць свае свечкі ад святога іерусалімскага агню. Яму, гэтаму імгненню, наканавана заставацца ў сэрцах на доўгія гады.

Яўген ПЯСЕЦКІ,
пастаянны ўдзельнік Міжнародных навукова-асветніцкіх экспедыцый «Дарога да святыняў»

Удзельнік экспедыцыі паэт Міхась Башлакоў з вясковымі чытачамі.

На пакланенне цудадзейнаму абразу людзі прыходзяць сем'ямі.

Факты з дзённікаў экспедыцый

• Маршрут 21-й Міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў» у 2014 годзе праходзіць праз гарады і вёскі Мінскай і Гродзенскай абласцей. За ўсе мінулыя гады паломнікі праехалі і прайшлі, несучы цудадзейны абраз і лампаду са Святым агнём, больш за 26000 кіламетраў. Амаль 600 кіламетраў было пераадолена падчас хрэснага ходу, да якога далучыліся амаль 3 мільёны чалавек. У мерапрыемствах, згодна з планамі экспедыцый, удзельнічалі звыш 4 мільёнаў чалавек.

• У агульным Садзе малітвы на вуліцах і плошчах населеных пунктаў удзельнікі экспедыцыі разам з мясцовымі жыхарамі пасадзілі амаль тысячу яблынек, туй, бярозак, дубкоў, лістоўніц.

• Дабрадатным агнём, які нясе экспедыцыя, асвечаны 500 храмаў, манастыроў, капліц. У 2000 аўдыторый адбыліся выступленні членаў экспедыцыі: святароў, вучоных, літаратараў, дзеячаў мастацтва.

• Тым, хто не меў магчымасці сустракаць экспедыцыю і прысутнічаць на набажэнствах, удзельнікі экспедыцыі самі прывезлі свечкі, апаленыя святым агнём: у бальніцы, прытулкі, спецыяльныя адукацыйныя ўстановы, дамы ветэранаў.

• Па матэрыялах мінулых экспедыцый выдадзены зборнікі навукова-асветніцкіх артыкулаў і тэзісаў выступленняў на сустрэчах і канферэнцыях.

Экспедыцыя крочыць па маршруце.

ГАРАДЫ-СТАЛІЦЫ ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА:

ПОЛАЦК — 1994 і 2003 гады

Найстаражытнейшы беларускі горад першым прымаў свята беларускага пісьменства і друку. За сваю гісторыю Полацк перажыў уварванні вікінгаў, паспяхова змагаўся супраць крыжаносцаў, не раз быў акупаваны войскамі розных заваёўнікаў, аднак зноў аднаўляў сваю незалежнасць. У X—XIII стагоддзях горад быў цэнтрам Полацкага княства. З'яўляўся і адным з асяродкаў хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях. Тут нарадзіліся беларуская асветніца Еўфрасіння Полацкая і наш славуты першадрукар Францыск Скарына.

ТУРАЎ — 1995 і 2004 гады

У канцы I тысячагоддзя нашай эры Тураў стаў палітычным, эканамічным і культурным цэнтрам Тураўскага княства. У гэты час у горадзе ўзнікла адна з першых на Русі епіскапій паводле грэчаскага ўзору. У 1865 годзе ў Тураве выяўлены адзін з найбольш ранніх помнікаў усходнеславянскага пісьменства XI стагоддзя — Тураўскае Евангелле. Гэтае Евангелле — самая ранняя (з тых, што захаваліся) кніга, створаная на беларускіх землях. Вядомы дзеяч гэтай зямлі Кірыла Тураўскі напісаў выдатныя царкоўнаасветніцкія і царкоўналітаратурныя творы, за што сучаснікі празвалі яго другім Залатавустам.

НАВАГРУДАК — 1996 год

Навагрудак — першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта тут быў каранаваны князь Міндоўг. Горад адыграў вялікую ролю і ў айчыннай гісторыі, бо менавіта тут зарадзілася беларуская дзяржаўнасць. У 1415 годзе ў Навагрудку склікалі духоўны сабор, на якім быў выбраны незалежны ад Масквы мітрапаліт Вялікага Княства Літоўскага Рыгор Цамблак. У манастыры, што знаходзіцца на Навагрудчыне, створана Лаўрышаўскае Евангелле. Тут нарадзіўся славуты паэт Адам Міцкевіч, які ў многіх сваіх творах апяваў навакольныя мясціны.

НЯСВІЖ — 1997 год

Нясвіж з'яўляецца колішняй рэзідэнцыяй роду князёў Радзівілаў — некаранаваных каралёў Вялікага Княства Літоўскага. Тут і дагэтуль захаваўся створаны імі палацава-паркавы ансамбль XVI—XIX стагоддзяў. У 2005 годзе ён быў уключаны ў Спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Размешчаны ў Нясвіжы касцёл Божага Цела — першы ва Усходняй Еўропе храм, збудаваны ў стылі барока. Нясвіжская ратуша — таксама самая старажытная з усіх ратуш, якія захаваліся ў Беларусі. Князі Радзівілы спрыялі развіццю кнігадрукавання. У 1562 годзе тут адкрыта Нясвіжская друкарня, у якой выйшлі ў свет працы філосафа і гуманіста Сымона Буднага. Выдадзены ім «Катэхізіс» — першая друкаваная кніга на беларускай мове.

ОРША — 1998 год

Гістарычна Орша — адзін з памежных фарпостаў Полацкага княства. Менавіта тут праходзілі славутыя перамовы Усяслава Чарадзея з кіеўскімі князямі, калі апошнія парушылі дамоўленасці і ўзялі полацкага князя ў палон. Найважнейшым укладам аршанцаў у гісторыю кнігадрукавання з'яўляецца праца мясцовага асветніка XVII стагоддзя Спірыдона Собаля, стваральніка буквара. Заснаваная ім пад Оршай Куцеінская друкарня стала цэнтрам беларускага кірылічнага кнігадрукавання. У 1812 годзе ў Оршы было знойдзена Аршанскае Евангелле, рукапісны помнік канца XII — пачатку XIII стагоддзя.

ПІНСК — 1999 год

Пінск лічыцца адным з гістарычных і культурных цэнтраў Палесся. У XII стагоддзі ён быў цэнтрам самастойнага Пінскага княства, пазней уваходзіў у склад Тураўскага. У Пінску ў першай палове XVIII стагоддзя езуіты стварылі друкарню і выпускалі хрысціянскую і свецкую літаратуру на лацінскай і польскай мовах. У 1912—1914 гадах у Пінску працаваў настаўнікам у прыходскай школе Якуб Колас. Пакінуў тут свой след і Напалеон Орда — беларускі літаратар, кампазітар, музыкант, мастак. На гэтай зямлі нарадзілася і беларуская паэтка Яўгенія Янішчыц.

ЗАСЛАЎЕ — 2000 і 2014 гады

Заслаўе — адзін са старажытных гарадоў Беларусі, які ўзнік яшчэ ў канцы X стагоддзя. Сюды, як вядома, кіеўскі князь Уладзімір саслаў сваю жонку Рагнеду і сына Ізяслава — за тое, што хлопчык, абараняючы гонар маці, зрабіў замах на жыццё князя. Горад названы ў гонар мужнага княжыча. Рагнеда, стала першай хрысціянкай і манахіняй на нашых землях. Яшчэ Заслаўе вядомае тым, што ў 2-й палове XVI стагоддзя тут пры кальвінскім зборы беларускі асветнік, гуманіст, рэлігійны рэфарматар Сымон Будны надрукаваў Біблію.

МСЦІСЛАЎ — 2001 год

Мсціслаў заснаваны ў сярэдзіне XII стагоддзя смаленскім князем Расціславам Мсціслававічам і названы ў гонар яго бацькі Мсціслава Вялікага — апошняга князя Кіеўскай Русі. У свой час горад быў цэнтрам Мсціслаўскага княства і Мсціслаўскага ваяводства. Сярод знакамітых выхадцаў і жыхароў гэтай зямлі Ілья Капіевіч — выдавец і аўтар створанай на заказ Пятра I рускай граматыкі. Тут нарадзіўся адзін з рускіх першадрукароў Пётр Мсціславец, а таксама народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў. У пісьменніка Уладзіміра Караткевіча пра гэты горад напісана цэлая мастацка-дакументальная кніга пад назвай «Мсціслаў».

МІР — 2002 год

Першыя пісьмовыя згадкі пра Мір адносяцца да канца XIV стагоддзя — часу, калі крыжакі, якія прайшлі праз Ліду і Навагрудак, спалілі яго. У канцы XVI — пачатку XVII стагоддзя замак у Міры абнеслі земляными валамі і ён ператварыўся ў крэпасць, трапіць у якую было магчыма толькі праз вароты. Гарадок быў надзвычай шматнацыянальным, і гэта добра прасочваецца дзякуючы розным рэлігійным будынкам, што размяшчаліся вакол Рыначнай плошчы — драўляная мячэць (не захавалася), двор сінагогі, ешыбот, Траецкая царква, касцёл Святога Мікалая. У наш час назва невялікага мястэчка Мір шырока вядомая за межамі Беларусі дзякуючы галоўнай архітэктурнай каштоўнасці — замку, які ў 2000-м унеслі ў Спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Пазней адбылася нават міжнародная «каранацыя» замка.

КАМЯНЕЦ — 2005 год

У Камянцы знаходзіцца адзіны на тэрыторыі Беларусі архітэктурны помнік Старажытнай Русі, які захаваўся ў цэлым выглядзе да нашых дзён, — гэта Камянецкая вежа, якую часам называюць яшчэ Белай вежай (ёй больш за 700 гадоў!). У сярэднія вякі жыхары Камянца з гонарам сцвярджалі, што ўсе дарогі ідуць праз іх горад, бо ён займаў важнае палітычнае і геаграфічнае становішча на карце Еўропы. Камянецкі край — радзіма многіх вядомых людзей: гісторыка, грамадскага дзеяча, першага прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі Усевалада Ігнатоўскага; асветніка, публіцыста і палітычнага дзеяча Міхаіла Карповіча; тэатральнага дзеяча і пісьменніка Уладзіміра Стэльмаха і іншых.

ПАСТАВЫ — 2006 год

Паставы вядомыя з сярэдзіны XVI стагоддзя як прыватнае мястэчка, якое належала магнатам Дэспатам-Зяновічам. У другой палове XVIII стагоддзя Паставы перайшлі да надворнага падскарбія Вялікага Княства Літоўскага Антонія Тызенгаўза. Па яго ініцыятыве тут былі пабудаваны фабрыкі, ткацкія майстэрні, млын, гарбарня, архітэктурны комплекс з жылых дамоў, гандлёвых радоў і палаца. Пэўны час тут дзейнічала тэатральная школа Тызенгаўза, перавезеная з Гродна. Выхадцам з Пастаўскага раёна з'яўляецца беларускі пісьменнік Уладзімір Дубоўка.

ШКЛОЎ — 2007 год

У XVI—XVII стагоддзях у Шклове існаваў магутны замак і ўмацаванні вакол яго, ваяводам троцкім Аляксандрам Хадкевічам тут быў пабудаваны кляштар дамініканаў. Аднак усё згарэла з-за шматлікіх войнаў, горад давялося ўзнаўляць літаральна з нуля. У XVIII стагоддзі ў Шклове заснаваны тэатр Зорыча, у рэпертуар якога ўваходзілі драмы, камедыі, камічныя оперы і балеты. У спектаклях, акрамя прыгонных, удзельнічалі кадэты мясцовага кадэцкага корпуса і дваране-аматары. На пачатку XIX стагоддзя Шклоў з'яўляўся важным гандлёвым цэнтрам, беларускай прыстанню на Дняпры.

БАРЫСАЎ — 2008 год

Барысаў — адно са старажытных паселішчаў Беларусі. Цягам XIII—XIV стагоддзяў у горадзе вялося будаўніцтва замка. Падчас войнаў з Маскоўскай дзяржавай тут знаходзілася стаўка вялікага князя Аляксандра, затым стаўка вялікага князя Жыгімонта Старога. У свой час горад быў цэнтрам павета Мінскай губерні. З гэтых мясцін паходзяць аўтар тэкстаў Гімна БССР і Рэспублікі Беларусь Міхась Клімковіч, стваральніца першага савецкага беларускага буквара Надзея Сіўко, мастак Валерый Шкаруба і скульптар Анатоль Анікейчык.

СМАРГОНЬ — 2009 год

Першая пісьмовая згадка пра Смаргонь звязана з імем Юрыя Іванавіча Зяновіча. Ён адкрыў пры смаргонскім храме школу і сабраў вялікую бібліятэку (канец XV — пачатак XVI стагоддзя). Смаргонь праславілася папяровай мануфактурай, школай дрэсіроўкі мядзведзяў (Смаргонская акадэмія), заснаванай князямі Радзівіламі. Сёння ў раёне працуе Літаратурна-мемарыяльны музей-сядзіба Францішка Багушэвіча ў Кушлянах, дзе жыў творца. Мясцовыя брэнды таксама — Крэўскі замак і музей-сядзіба Міхала Клеафаса Агінскага ў Залессі (тут быў створаны славуты паланэз «Развітанне з Радзімай»).

ХОЙНІКІ — 2010 год

Хойнікі як мястэчка вядомыя з сярэдзіны XVI стагоддзя, імі валодалі князі Вішнявецкія, Шуйскія, Прозары. У першай палове XVII стагоддзя на невялікай дзюне ў забалочанай пойме ракі Квеся князі Вішнявецкія пабудавалі замак з абарончымі сценамі, уязной вежай-брамай. Замак праіснаваў да XVIII стагоддзя. Хойнікі вядомыя і як радзіма народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. Адсюль родам таксама празаік Барыс Сачанка, паэты Мікола Мятліцкі і Ала Канапелька.

ГАНЦАВІЧЫ — 2011 год

У Ганцавічах нарадзіліся вядомыя беларускія дзеячы культуры: фальклярыст, этнограф, публіцыст Аляксандр Сержпутоўскі, паэты Міхаіл Рудкоўскі і Віктар Гардзей. У спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі занесена панская сядзіба ў вёсцы Агарэвічы — помнік драўлянага дойлідства XIX стагоддзя. Ганцаўшчына непарыўна звязана з жыццём і творчасцю Якуба Коласа. Менавіта на ганцавіцкай зямлі адбываецца дзеянне першай кнігі знакамітай коласаўскай трылогіі «На ростанях»: у творы фігуруе мясцовая вёска Люсіна, якую аўтар назваў Цельшына.

ГЛЫБОКАЕ — 2012 год

Першыя пісьмовыя згадкі пра Глыбокае знойдзены у Метрыцы ВКЛ. Калісьці тут быў пабудаваны замак, мелася развітая гарадская інфраструктура. Хоць многае было знішчана падчас войнаў і пажараў, гісторыка-культурная спадчына Глыбоччыны ўражвае і сёння: тут захавалася больш за 60 помнікаў архітэктуры, 17 храмаў — помнікаў архітэктуры, сярод якіх 4 — помнікі рэспубліканскага значэння, маюцца курганы, дэндрарый. Глыбоччына дала свету Язэпа Драздовіча, Вацлава Ластоўскага, Паўла Сухога і Паліну Мядзёлку.

БЫХАЎ — 2013 год



Быхаў здаўна вядомы як моцны горад, непрыступны бастыён. У другой палове XVI стагоддзя Хадкевічы заснавалі ў ім майстэрню, у якой выраблялі шротавыя гарматы, разнастайныя марціры і іншае ўзбраенне. На высокім беразе Дняпра быў пабудаваны замак, які захаваўся да нашых дзён. Пасля таго, як Быхаў абнеслі вялізнымі 800-метровымі земляными валамі з бастыёнамі, равелінамі і ровам, ён увогуле стаў непрыступным для ворагаў. У пачатку XVII стагоддзя на Быхаўшчыне быў створаны Баркулабаўскі летапіс — летапісны звод, помнік беларускага летапісання.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Не прапусці

«НАВУКАМАНІЯ»: адарвацца ад экрана немагчыма

Як вырошчваюцца ствалавыя клеткі? Што ўяўляюць сабой ДНК-пашпарты? Чым выклікана неабходнасць будаўніцтва Беларускай АЭС? Як Беларусь стала касмічнай дзяржавай? На гэтыя і многія іншыя пытанні беларускія гледачы змогуць знайсці адказ на тэлеканале «Беларусь 3», дзе 7 верасня стартуе прэм'ерны паказ цыкла «Навукаманія».

Прэс-прэзентацыя новага праекта прайшла ў штабе беларускай навукі — Акадэміі навук з удзелам членаў прэзідыума акадэміі, якія не ўтойвалі сваёй удзячнасці за зробленую журналістамі работу.

— Гэта вялікае мастацтва — казаць простай і даступнай мовай пра складанае, — лічыць **галоўны вучоны сакратар Акадэміі навук, доктар біялагічных навук, член-карэспандэнт Аляксандр КІЛЬЧЭЎСКІ.** — За апошнія гады прэстыж прафесіі вучонага моцна пахіснуўся ў беларускім грамадстве. Але, калі мы фарміруем эканоміку ведаў, то як можам гэта зрабіць без вучонага? Вельмі важна, каб у навуку прыходзіла моладзь. А прыцягнуць туды маладых людзей можна не толькі заробкам, але і магчымасцю самарэалізавацца ў любімай справе. Мы павінны ствараць для іх такія ўмовы, адкрываць перад імі захапляльны свет беларускай навукі, каб «заразіць» іх вірусам даследаванняў.

— Праграма пра навуку ні ў якім разе не можа быць сумнай, хоць для многіх навука і нуда — словы-сінонімы. Насамрэч, такое меркаванне трэба разбураць, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі **старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь ДАВЫДЗЬКА.** — Навука — гэта прыгоды, азарт, пагоня, дэтэктыў і не інакш. Мы жывём у час барацьбы розумаў: раней на планеце была барацьба ўзбраенняў і палітычных ідэй, а сёння ўсе войны выйграюць не палітыкі і ваенныя, а навукоўцы. Стварэнне цыкла перадач пра дасягненні беларускай навукі і яе перспектывы было прамым даручэннем кіраўніка нашай дзяржавы. Трэба, каб беларусы ведалі не толькі выбітных беларускіх спартсменаў ці дзеячаў культуры, але і тых, хто рухае наперад прагрэс, хто ўзвышае нашу нацыю.

У апошнія дзесяць ці нават дваццаць гадоў навука і вучоныя неяк зніклі з тэлевізійнай прасторы, прычым не толькі ў нашай краіне, але і ў суседніх. І сёння навукоўцы з сумам прыгадваюць перадачу «Відавочнае — неверагоднае», якую віртуозна ствараў акадэмік Сяргей Капіца. Знік з расійскага тэлебачання і тэлепраект «Цывілізацыя».

Цыкл праграм «Навукаманія» ствараўся ў жанры журналісцкага расследавання, каб захапіць увагу гледачоў і не адпускаць яе да канца. Кожная з 12 праграм цыкла прысвечана аднаму з кірункаў у беларускай навуцы. Трансплантацыя органаў і высокія тэхналогіі, фармацэўтыка і трансгенныя расліны, космас і першая атамная электрастанцыя — вось далёка не поўны спіс тэм перадач.

Гледачы канала змогуць адкрываць для сябе свет беларускай навукі раз на тыдзень, па нядзелях. Першая праграма «Праз цернії да зорак» выйдзе 7 верасня ў 12.55. Яна раскажа пра поспехі беларускай навукі: даследаванні космасу, распрацоўку медыцынскіх прэпаратаў, новыя спосабы перапрацоўкі нафтапрадуктаў, стварэнне імпартазамяшчальнай прадукцыі, будаўніцтва Беларускай АЭС, прымяненне навуковых адкрыццяў для захавання гісторыка-культурных каштоўнасцяў, у тым ліку і пра тэхналогію стварэння слуцкіх паясоў.

«Навука — гэта прыгоды, азарт, пагоня, дэтэктыў і не інакш. Сёння ўсе войны выйграюць не палітыкі і ваенныя, а навукоўцы...»

Немалаважна, што паглядзець цыкл «Навукаманія» змогуць і гледачы спадарожнікавага тэлеканала «Беларусь 24», які выходзіць за межы краіны.

Надзея НІКАЛАЕВА

КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»

на IV квартал або II паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце **ДА 9 КАСТРЫЧНІКА 2014 ГОДА** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**

7 цеплавентылятараў Electrolux

Суперпрыз — хлебапец

Сярод падпісчыкаў 14.10 2014 года будзе разыграна 7 цеплавентылятараў і суперпрыз — хлебапеч. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 24.10.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.12.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2014 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні «У цёплую зіму са «Звяздою» чытайце ў нумары газеты «Звязда» за 4.09.2014.

Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.

ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 6.09.14 ПА 31.12.14.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2422 ад 01.09.14, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2014 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ на IV кв. або 2-е паўг. 2014 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Уважаемые акционеры!

Открытое акционерное общество

«Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин

ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 18 сентября 2014 года в 14.00 ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ОЧНОЙ ФОРМЕ по адресу: г. Кобрин, ул. Советская, 109, зал заседаний.

ПОВЕСТКА ДНЯ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ:

1. О переименовании Общества без реорганизации.
2. О внесении изменений и дополнений в устав Общества и его утверждении в новой редакции.
3. О досрочном прекращении полномочий членов наблюдательного совета Общества.
4. О досрочном прекращении полномочий членов ревизионной комиссии Общества.
5. Об избрании членов Совета директоров Общества.
6. Об избрании членов ревизионной комиссии Общества.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 в день и по месту проведения собрания на основании: акционер — паспорт; представитель — паспорт и доверенность, оформленная в соответствии с действующим законодательством.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 5 сентября 2014 г.

Наблюдательный совет

УНП 200093330

Открытое акционерное общество

«Дорожно-строительный трест № 3»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 16 сентября 2014 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Повестка дня:

1. Об утверждении результатов проведения закрытой подписки и увеличения уставного фонда.
2. Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций общества.
3. О внесении изменений в устав общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 16.09.2104 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 10.09.2014 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомится с материалами к собранию по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-87 — Отдел правовой и кадровой работы.

Наблюдательный совет.

УНП 700049607

РУП «Белпочта»

УНП 101015738

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ ИНЖЕНЕРНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ДЛЯ ВЫПОЛНЕНИЯ РАБОТ ПО ОСУЩЕСТВЛЕНИЮ ТЕХНИЧЕСКОГО НАДЗОРА на объекте «Капитальный ремонт с модернизацией системы освещения помещений общежития РУП «Белпочта» по ул. Надеждинской, 23».

Процедура переговоров состоится 10 сентября 2014 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10. Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства – тел.: 293 55 29, 293 55 28.

■ Зямное і духоўнае

БЫЦЬ МАРАЛЬНЫМІ — ДАСТУПНА ДЛЯ ЎСІХ

Ідэя аднаўлення праваслаўнай адукацыі знайшла падтрымку ў беларускай адукацыйнай сістэме

Так, паміж Беларускай праваслаўнай царквой і Мінадукацыі было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве. Больш за дзясятак установ адукацыі супрацоўнічаюць з суполкамі БПЦ. Які плён гэта дае, якім чынам развіваецца духоўнае выхаванне ў краіне і якія спрэчныя пытанні ў гэтай галіне яшчэ не вырашаны?

Прадстаўнікі царквы і ўстаноў адукацыі адзінагалосна падкрэсліваюць, што пад праваслаўным выхаваннем у першую чаргу варта разумець адраджэнне духоўнасці беларускага народа, фарміраванне яго грамадзянскіх і маральных якасцяў. Як адзначыў **кандыдат багаслоўя, дацэнт Мінскай духоўнай акадэміі, епіскап Барысаўскі Веньямін,** знаёмства навучэнцаў з асновамі праваслаўнай культуры пачынаецца ўжо ў пачатковай школе, калі з першага класа дзеці чытаюць расказы аб Еўфрасінні Полацкай, Кірылу Тураўскім, святах Божага Нараджэння і Уваскрэсення…

Начальнік управўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Сяргей МАЛОЧНІКАЎ падкрэсліў, што ў Беларусі склалася досыць стройная сістэма ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі і БПЦ. «Усё гэта мае сваё нарматыўна-прававое рэгуляванне. Ёсць і праграма ўзаемадзеяння. Сёлета заканчваецца адна праграма і будзе распрацоўвацца іншая. Хутчэй за ўсё, яна будзе ахопліваць перыяд да 2020 года».

У межах супрацоўніцтва царквы і міністэрства ўжо рэалізаваны шэраг мерапрыемстваў, многія яшчэ плануюцца. Так, у Полацку мяркуюць правесці XIII Свята-Еўфрасіннеўскія чытанні на тэму духоўна-маральнага падмурка патрыятычнага выхавання. Сёлета стартуе і новы праект — «Калядныя чытанні», якія будуць праходзіць у Беларусі ў канцы года. На гэтай канферэнцыі будуць сабраны лепшыя напрацоўкі ў сферы адукацыі, якія затым прадставяць на аналагічных чытаннях у Маскве, што пройдуць 20–22 студзеня 2015 года.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Пры арганізацыі духоўна-маральнага выхавання ўстановы адукацыі грунтуюцца на прынцыпе свецкага характару адукацыі і не маюць за мэту фарміраванне таго ці іншага стаўлення да рэлігіі», — пераканана **начальнік управўлення выхаваўчай і ідэалагічнай работы Нацыянальнага інстытута адукацыі Мінадукацыі Наталля КАТОВІЧ.** Яна падкрэсліла наяўнасць свабоднага выбару ў вучняў і іх бацькоў поглядаў і перакананняў.

Беларусь — краіна шматканфесійная і шматнацыянальная. Ці не стане ўвядзенне праваслаўнай адукацыі глебай для міжканфесійных рознагалоссяў? Спецыялісты запэўніваюць, што не стане. Духоўна-выхаваўчыя дысцыпліны ўводзяцца ва ўстановах адукацыі ў якасці факультатываў, якія вучні могуць наведваць, зыходзячы з уласнага жадання і заявы, напісанай бацькамі. Дарэчы, такія факультатывы маюць грыф Мінадукацыі і іх праграмы, нароўні з праграмамі іншых факультатыўных курсаў, можна знайсці на нацыянальным адукацыйным партале, які нядаўна пачаў працу ў тэставым рэжыме. Да таго ж, заўважылі спецыялісты міністэрства, з прадстаўнікоў усіх канфесій, што існуюць у Беларусі, толькі праваслаўная царква выступіла з ініцыятывай аб супрацоўніцтве, хаця такая магчымасць ёсць ва ўсіх.

Праўда, казаць пра маштабы ахопу ўстаноў адукацыі духоўна-рэлігійным выхаваннем пакуль складана. Вынікі апошніх апытанняў не цешаць: факультатывы па асновах праваслаўнай культуры гатовы наведваць адзінкі.

«Сярод бацькоў фарміруецца ўяўленне, што іх дзецям важней атрымаць добрую прафесію, але добрым прафесіяналам не можа быць чалавек, недасканалы ў духоўна-маральным плане», — лічыць уладыка Веньямін. Яго падтрымаў і **доктар тэалогіі, дацэнт Мінскай духоўнай акадэміі, протаіерэй Сергій ЛЕПІН,** дадаўшы, што не ўсе могуць дасягнуць вышынь у навуках, але быць людзьмі маральнымі даступна для ўсіх.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Курыная вяндліна

Спатрэбіцца: курыца (на 1,4-1,5 кг), шампіньёны (свежыя) — 400 г, соль (на смак), перац духмяны (на смак), алей — 3 ст. л.

Грыбы мыем і дробна нарэзаем кубікамі. Абсмажваем на алеі на невялікім агні. Неабходна, каб грыбы аддалі ўсю вадкасць і яна выпарылася. Па часе — гэта недзе хвілін 30. Пакуль грыбы абсмажваюцца, займаемся курыцай. Бяром вельмі востры нож і акуратна здымаем скурку, імкнучыся яе не пашкодзіць, бо менавіта ў скурку мы будзем загортваць сумесь мяса і грыбоў. Курынае мяса здымаем з костак і нарэзаем акуратнымі кавалачкамі. Змешваем фарш, дадаём соль і перац (на смак) і выкладваем на скурку, пад якую падкладзена харчовая плёнка (каб потым перанесці на фольгу). Фарш акуратна загортваем у скурку, пераносім на змазаную алеем фольгу. Фольгу загортваем і кладзём на бляху. Ставім у духоўку на 1,5 гадзіны пры 180 °С. Пасля гэтага вяндліну дастаём з духоўкі і, не разгортваючы фольгі, астуджаем, паклаўшы невялікі гнёт (напрыклад, пакет соку). Астылая вяндліна ўжо гатова да ўжывання, але будзе лепш, калі яе патрымаць ноч у халадзільніку.

Фасоля па-грузінску

Спатрэбіцца: фасоля — 300 г, арэхі грэцкія ачышчаныя — 1 шклянка, цыбуля рэпчатая — 1-2 галоўкі, часнок — 1 галоўка, алей, перац чырвоны горкі, перац чорны молаты, соль на смак, зеляніна кропу, пятрушкі, кінза.

Фасолю цёмных гатункаў адварыць да гатоўнасці. Грэцкія арэхі здрабніць. Дробна нарэзаную цыбулю спасераваць у алеі. Адвараную фасолю расцерці, змяшаць з цыбуляй і арэхамі, дадаць здробнены часнок, дробна нарэзаны чырвоны перац і здробненую зеляніну, паперчыць і пасаліць на смак. Грэцкія арэхі, чырвоны перац і зеляніну можна прапусціць праз мясарубку.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

Прышчэпкі з маладымі, якія цалуюцца

Яны робяцца вельмі хутка, а выглядаюць проста клас! Такія аксесуары можна выкарыстоўваць для ўпрыгожвання вясельнага торта, а калі іх шмат, то чапляць на запрашальныя паштоўкі.

Нам спатрэбіцца: драўляныя прышчэпкі, акрылавыя фарбы, шнурок або цюль для вэлюму, клей.

Алоўкам малюем максімальна просты смокінг з гальштукам-матыльком і вясельную сукенку. Акрылавымі фарбамі размалёўваем наш эскіз. З цюлю робім вэлюм і мацуем яго з дапамогай клею.



САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

Пажыўная і ачышчальная маска з грушы

Надзерці на дробнай тарцы адну грушу, дадаць столькі здробненых на кавамолцы аўсяных шматкоў, каб атрымалася кашка, нанесці на твар на 15 хвілін. Змыць прахалоднай гатаванай вадой.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.26	19.49	13.23
Віцебск —	6.14	19.40	13.26
Магілёў —	6.16	19.39	13.23
Гомель —	6.15	19.33	13.18
Гродна —	6.42	20.03	13.21
Брэст —	6.44	20.02	13.18

Месяц

Поўня 9 верасня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Арсенія, Георгія, Пятра.*
К. *Беаты, Яўгеніі, Захара, Германа, Міхаіла, Яўгена.*

ЗАЎТРА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Даты | Падзеі | Людзі

1714 год — нарадзіўся (вёска Дзітрыкі, цяпер Лідскі раён) Міхал Карыцкі, паэт, педагог, магістр філасофіі і свабодных навук (1745), доктар філасофіі. Вучыўся ў школе Бабруйскай езуіцкай рэзідэнцыі. У 1733 годзе скончыў Слуцкую семінарыю, у 1736-м — Віленскую акадэмію. Выкладаў у калегіумах Варшавы, Мінска, Драгічына, у Віленскай акадэміі. З 1773 года — рэктар Мінскай ваяводскай школы. Пісаў на лацінскай мове. Найбольш вядомая паэма «Птушыны сейм» — сатыра на мясцовую шляхту і магнатаў Рэчы Паспалітай. Сярод іншых твораў — вершы, пасланні палітычным дзеячам і паэтам, пародыі. Памёр у 1781 годзе. Паэтычная спадчына выдадзена пад назвай «Песні» ў 1817 г.

1907 год — нарадзіўся (пасёлак Церахоўка, цяпер Добрушскі раён) Леанід Рыгоравіч Рахленка, вядомы беларускі рэжысёр і акцёр, народны артыст Беларусі (1946) і СССР (1966). У 1929—1981 гг. працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Купалы (у 1937—43 гг. — мастацкі кіраўнік). Сярод роляў: Гарлахвацкі («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы), Сымон («Салавей» З. Бядулі), Бубноў («На дне» М. Горкага) і іншыя. Здымаўся ў кінафільмах «Міколка-паравоз», «Палеская легенда», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Веснавыя навальніцы». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1970). Памёр у 1986 годзе.

1936 год — заснавана ганаровае званне «Народны артыст СССР». Да 1917 года ў Расіі не было дзяржаўных званняў і ўзнагарод у галіне культуры. Іх сталі прысуджаць у савецкі час. 6 верасня 1936 года ВЦВК устанавіў званне «Народны артыст СССР» для асоб, якія «асабліва вызначыліся ў справе развіцця савецкага тэатра, музыкі і кіно». Гэта было першае вышэйшае ганаровае званне ў краіне. Пазней з'явіліся званні: народнага настаўніка, народнага мастака і народнага архітэктара. Першымі народнымі артыстамі СССР сталі Канстанцін Станіслаўскі, Уладзімір Неміровіч-Данчанка, спявачка Вялікага тэатра Антаніна Нжданава. Усяго гэтага звання ўдастоены 1007 чалавек. Апошнімі артыстамі, якія атрымалі ганаровае званне «Народны артыст СССР» у снежні 1991 года, сталі Ала Пугачова і Алег Янкоўскі.

Было сказана

Пётр МСЦІСЛАВЕЦ, рускі першадрукар:

«Нават калі толькі адзін талент будзе каму-небудзь даверaны, то належыць не ленавацца, а старанна працаваць, баючыся кары за яго ўтойванне».

НАРОДЖАНЫЯ 6 верасня

Жыццё гэтых людзей можа быць даволі нервовым і напружаным, але яны ў вышэйшай ступені пастаянныя і адданыя асобы. Сябры і сем'і выключна важныя для іх і могуць служыць ахоўным буферам паміж імі і больш жорсткім бокам жыцця. Большасць гэтых людзей клапоціцца аб тым, каб выглядаць прывабна, і ганарыцца сваёй знешнасцю. Яны высока ставяць прыгажосць і рамантычнасць кахання. Людзі 6 верасня цалкам аддаюцца ва ўладу лёсу. Яны схільныя да розных праяўленняў, якія часам спраўджваюцца, і павінны больш асцярожна ставіцца да асабістых слоў і ўчынкаў.

НАРОДЖАНЫЯ 7 верасня

Рашучыя людзі, якія зробяць усё, каб дасягнуць вызначанай мэты. Свет не спяшаецца зразумець і прызнаць іх, але сілай волі і творчым напорам сваіх ідэй яны з цягам часу схіляюць на свой бок многіх. Для тых, хто прымае іх бок, яны цудоўныя паплечнікі і сябры. У якасці галавы сям'і яны даволі ўмела накіроўваюць учынкі і натхняюць сваіх дзяцей і жонку ці мужа, але не церпяць парушэння субардынацыі. Часам з узростам яны становяцца больш мяккімі, але рэдка страчваюць сваю схільнасць да канкурэнцыі; ім неабходна навучыцца быць больш цярплівымі, не надта патрабавальнымі да блізкіх і да сябе.

УСМІХНЕМСЯ

— Дарагая, я надвячоркам з сябрамі піва вып'ю?
— Ну ідзі пі, алкаголік.
— Які алкаголік, я раз у тры месяцы з імі сустракаюся!
— Гультаяваты алкаголік!

Адлічаны студэнт Пятроў кожны дзень піша свайму дэкану з войска пра тое, што ён трапіў у спецназ і яго там вучаць забіваць.

З пачаткам навучальнага года інтэрнэт страціў каля 80% экспертаў у галіне паліталогіі, спорту, сексу і, наогул, усяго-усяго.

Ты зразумееш усю нікчэмнасць гадамі назапашаных ведаў і досведу, калі пяцігадовае дзіця спытае цябе, чаму шамаціць пакет.

Аб'ява ў заапарку: «Паважаныя малпы, да вас дойдзе хутчэй: не ешце ў людзей з рук!»

Каця, заспеўшы мужа ў ложку з палюбоўніцай, хутка сабрала рэчы і пайшла. А, трэба сказаць, на кватэры ў палюбоўніцы былі вельмі дарагія рэчы.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.120. Індэкс 63850. Зак. № 3547. Нумар падпісаны ў 19.30
5 верасня 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

«НАМ ПРЫЕМНА НЕСЦІ ДА ЛЮДЗЕЙ ДРУКАВАНАЕ СЛОВА»

Наш каляндар багаты на святы — і дзяржаўныя, і прафесійныя... Але ў апошнія гады ўсё больш увагі двум — Дню роднай мовы, Дню беларускага пісьменства. Што цалкам лагічна, як падаецца, бо, паводле аднаго з паэтаў, «без роднай мовы людзі ў родным краі, як тыя кватаранты-немтуры», паводле другога ж, «адкрыцці, якім нялёгка роўных падшукаць», — агонь і слова...

Сярод тых, хто — літаральна — даносіць яго да людзей, хто распаўсюджвае друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, і Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта». Некалькі пытанняў напярэдадні свята мы задалі яго генеральнаму дырэктару спадарыні Ірыне САКСОНАВАЙ.

— Ірына Ігнатаўна, некалі газеты і часопісы выпісвалі ўсе, хоць для афармлення падпіскі чалавеку трэба было ісці на пошту...

— Цяпер зрабіць гэта нашмат прасцей, нават не выходзячы з дому ці з офіса — праз інтэрнэт-сайт нашага прадпрыемства. Да паслуг кліентаў — уладальнікаў пластыкавых банкаўскіх картак — і нашы плацежна-даведачныя тэрміналы. Як паказвае статыстыка, гэтыя спосабы афармлення падпіскі набываюць усё большую папулярнасць. За апошнія тры гады, напрыклад, колькасць заказаў, аформленых праз сайт, павялічылася больш чым у два разы. Апроч таго, паранейшаму працуюць грамадскія распаўсюджвальнікі, нашы паштальёны. Іх можна запрасіць на прадпрыемства, да сябе дамоў...

Дзякуючы шырокай сетцы аддзяленняў сувязі і ўласнай лагістыцы жыхары самых аддаленых хутароў і вёсачак могуць аформіць заказ і атрымаць паштовае адпраўленне з кнігамі.

— Тым не менш тыражы падаюць.

— Сапраўды, зніжэнне колькасці падпісных друкаваных выданняў назіраецца, і не толькі ў Беларусі. Прычына таму відавочная: для атрымання інфармацыі з'яўляюцца ўсё новыя тэхнічныя магчымасці. Праз той жа інтэрнэт у любы зручны час і бясплатна можна пазнаёміцца з электроннымі версіямі большасці выданняў.

Але ж з боку насельніцтва ўзровень даверу да друкаванай прэсы па-ранейшаму застаецца высокім.

— Мая сяброўка з Бярэзіншчыны, апроч іншага, выпісвае «Литературную газету», суседзі — «Известия», «Аргументы и факты». А якія яшчэ, скажам так, замежныя выданні захавалі сваю папулярнасць у нашай краіне?

— Падпісны тыраж замежных выданняў невялікі. У агульным аб'ёме прынятай намі падпіскі ён складае ўсяго 2,3%. Да запатрабаваных можна аднесці расійскую газету «Здоровый образ жизни — Вестник «ЗОЖ» (тыраж каля 5,5 тысячы), часопісы «Бурда», « Лиза», «Моя прекрасная дача».

— Не вам казаць, нехта выпісвае адну газету, а нехта і ва ўсе часы (здымаем капялюш) — абавязкова «раёнку», абавязкова абласную, абавязкова рэспубліканскую плюс часопіс... Але ж заўсёды былі і, відаць, засталіся падпісчыкі, на адрас якіх прыходзіць куды больш выданняў?

— Тыя, хто выпісвае 5-10, а то і больш найменняў літаратурна-мастацкіх і навукова-папулярных выданняў, вядома ж, ёсць, але іх няшмат, гэта ў асноўным людзі пажылога ўзросту.

— А што выпісваюць нашы бібліятэкі — і вялікія, і, скажам так, малыя?

— Наменклатура іх дасягае 1500 найменняў. Яна вельмі разнастайная і фарміруецца ў залежнасці ад спецыфікі бібліятэкі. Гэта могуць быць навукова-тэхнічныя і навукова-папулярныя выданні, медыцынскія, грамадска-палітычныя, дзіцячыя... Нешта вылучыць тут вельмі складана.

— Ірына Ігнатаўна, на тэлебачанні час ад часу з'яўляецца досыць якасная, запамінальная рэклама «Кніжнага клуба». Яе ж (хай іншага кшталту) можна ўбачыць і ў аддзяленнях паштовай сувязі. Гэта свайго роду сумесны праект?

— «Кніжны клуб» карыстаецца паслугамі нашага прадпрыемства, што цалкам лагічна і зразумела. Дзякуючы шырокай сетцы аддзяленняў сувязі і ўласнай лагістыцы жыхары самых аддаленых хутароў і вёсачак могуць аформіць заказ і атрымаць паштовае адпраўленне з кнігамі.

Варта зазначыць, што гэтая паслуга карыстаецца добрым попытам і нам прыемна несці да людзей друкаванае слова.

— Першы дзень верасня ў нашай краіне — Дзень ведаў, першыя выхадныя — Дні беларускага пісьменства. Да гэтага свята, вядома ж, рыхтуюцца гарады, дзе яны праходзяць, рыхтуюцца кнігавыдаўцы, пісьменнікі і паэты, рэдакцыі газет і часопісаў... Як рыхтуецца ваша прадпрыемства?

— Гэта ўжо як правіла: у месцах масавых гулянняў падчас любога свята размяшчаюцца павільёны РУП «Белпошта». Усе ахвотныя там могуць адправіць лісты альбо паштоўкі, паставіць на іх памятны штэмпель, набыць маркі, канверты, сувеніры, тавары беларускіх вытворцаў, аформіць падпіску на любімыя выданні...

Сёлета да Дня беларускага пісьменства мы выпусцілі серыю немаркіраваных паштовак «Ілюстрацыі народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча да паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». Пакуль выдадзены 3 сюжэты, у кастрычніку будзе яшчэ 4.

Сёлета, як і ў папярэднія гады, у абарачэнне выйдуць паштовая марка, канверт. У нядзелю, 7-га верасня, там адбудзецца спецыяльнае памятнае гашэнне.

— Філатэлістам, вядома ж, не трэба казаць, што гэта такое, а вось усім астатнім, магчыма, ёсць сэнс?

— Спецыяльнае гашэнне праводзіцца ў гонар важнай падзеі альбо памятнай даты. Для яго папярэдне выпускаецца адмысловы (з той выявай і датай) штэмпель. Дзеянне яго строга абмежаванае: ён «жыве», так бы мовіць, толькі адзін дзень, а потым знішчаецца. Вось філатэлісты і стараюцца не ўпусціць магчымасць — набыць канверты, маркі з такімі адбіткамі. І, трэба сказаць, маюць рацыю, бо на самой справе, паштовая прадукцыя — гэта не толькі знак паштовай аплаты, не толькі вынік працы тых, хто яе ствараў і сведчанне густу тых, хто яе набыў, каб адправіць ліст або захаваць у сваёй калекцыі, — гэта, без перабольшвання, фрагмент гісторыі.

— Асобны дзякуй прадпрыемству за паштоўкі для посткросінгу. Яны, лічы, на ўвесь свет (Беларусь у лідарах па колькасці карыстальнікаў і адпраўленняў!) прапагандуюць нашу культуру і гісторыю, нашу кухню, нашу, у прыватнасці, унікальную літару «Ў»... Да таго ж у продажы цяпер вельмі шмат віншавальных паштовак з самымі рознымі святамі, у тым ліку і прафесійнымі...

— Мы, вядома ж, уважліва сочым за развіццём посткросінгу ў Беларусі, актыўна падтрымліваем гэты цікавы міжнародны кірунак. З 2009 года ў нас распрацавана і выпушчана каля 450 паштовак на самую розную тэматыку. Дарэчы, сёлета (апроч іншых 40) выйшла паштоўка «Удачы ў посткросінгу!».

А наогул мы стараемся ствараць сюжэты, дзякуючы якім людзі ў самым далёкім замежжы маглі б даведацца пра самабытнасць нашага краю, пра гістарычную і культурную спадчыну, нацыянальны каларыт, харство прыроды...

Да таго ж паштоўкі — не толькі для посткросінгу — валодаюць цудоўнейшай магчымасцю перадаваць пачуцці. Што, здавалася б, прасцей: завітаў у аддзяленне паштовай сувязі, набыў прыгожую альбо з нейкай цікавінкай паштовачку, напісаў колькі шчырых слоў-пажаданняў ды адправіў... Усё — можна ўяўляць, колькі радасці вашым блізкім прынясе гэта маленькае пасланне. Прычым не толькі зараз, у хуткім часе. Яго ж можна захоўваць — гадамі...

Паштовая прадукцыя — гэта не толькі знак паштовай аплаты, не толькі вынік працы тых, хто яе ствараў і сведчанне густу тых, хто яе набыў, каб адправіць ліст або захаваць у сваёй калекцыі, — гэта, без перабольшвання, фрагмент гісторыі.

— Паслуга гэта — старая, як свет... А пошта пастаянна радуе сваіх кліентаў новымі. Чаго чакаць у бліжэйшы час?

— У жніўні (можа хто прапусціў гэту інфармацыю) у жыхароў не толькі Мінска, але і ўсіх абласных цэнтраў з'явілася магчымасць атрымліваць пенсіі і дапамогі ў любым аддзяленні паштовай сувязі, незалежна ад месца пражывання.

Зноў жа не так даўно РУП «Белпошта» атрымала статус інфармацыйнага пасярэдніка агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы (ААІС). І зараз у нашых кліентаў у вылучаных аддзяленнях паштовай сувязі з'явіўся доступ да дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў.

Увосень наша прадпрыемства парадуе кліентаў зніжкамі. З 1 верасня, напрыклад, у рамках акцыі «Залатая восень» на 25% патаннела перасылка міжнародных грашовых пераводаў. Прома-акцыі, на якіх нашы спецыялісты будуць распавядаць пра новыя паслугі, паказваць, як карыстацца плацежна-даведачнымі тэрміналамі, як правільна пісаць адрасы, каб лісты як мага хутчэй даходзілі да адрасатаў, пройдуць у буйных сталічных і абласных аддзяленнях паштовай сувязі. Там жа будуць праводзіцца віктарыны, уручацца сувеніры... Так што загадзя запрашаю. У тым ліку — аформіць падпіску, бо нехта правільна сказаў: «Як газет чытаць не будзеш, дык і грамату забудзеш». А я дабавіла б яшчэ: «І кніг...».

— Тады раскажыце, калі ласка, якія выданні самі забіраеце з паштовай скрынкі? Ці знаходзіце час на добрую кнігу? Каго з беларускіх пісьменнікаў, добра ведаючы мову, чытаеце і перачытваеце?

— На мой погляд, і дзіўна, і недаравальна было б, нарадзіўшыся і пражыўшы добрую частку жыцця ў Беларусі, не любіць сваёй мовы, не ведаць яе. Падручнік па беларускай літаратуры, калі я вучылася у школе, называўся «Роднае слова». Так яно і было...

Кнігі я вельмі люблю! Чытаю іх з 5-гадовага ўзросту і дужа шкадую, што цяпер хіба зрэдку магу дазволіць сабе «адарвацца», як той казаў, пасядзець з добрай кніжкай. Але ж узяць яе ў рукі, пачытаць хоць крыху мне трэба абавязкова. У вольную хвіліну гэта самы любімы занятак.

А вось з пісьменнікаў самы любімы — Уладзімір Караткевіч. Вельмі падабаюцца творы Якуба Коласа і Максіма Багдановіча. Ужо колькі разоў перачытваю іх і ўсё роўна знаходжу штось новае — думкі, словы, пачуцці...

